**РАДЫЕ** У ГАДЗІНУ НОЧЫ:

**МАСКВА, 3. XVI канфэрэнцыя УсеКП(б) зьвярнулася з вялікаю адозваю да рабочых і працоўных сялян Савецкага Саюзу.**

(Тэкст адозвы будзе надрукаваны заўтра)

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

№ 98 (3206) Субота, 4-га Мая 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

**АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.**

**МАГІЛЕЎ, 3.** (Па тэлефону ад нашага кар.). Магілеўшчына адзначыла сьвята 1-га мая закладзінамі фабрыкі шоўку і скуранога заводу. Ад імя ўраду рабочых вітаў т. Карп і акрамя таго рад арганізацый, у тым ліку ЦСПСБ, менскі завод „Бальшавік" і гомельскі скураны завод. Паслана тэлеграмы з прывітаньнем ЦК КП(б)Б і тав. Гападзеду.

# У дзень сусьветнага пралетарскага сьвята

## ВУЛІЦЫ БЭРЛІНУ, ВАРШАВЫ, ВІЛЬНЫ, ЛЬВОВА, ЗАЛІТЫ КРЫВЁЮ РАБОЧЫХ

## Барыкадныя баі ў Бэрліне: 8 рабочых забіта, 80 цяжка параненых і звыш 1000 арыштаваных

## *КРЫВАВАЯ РАСПРАВА НАД КАМУНІСТЫМІ У РАБОЧЫХ ЦЭНТРАХ ПОЛЬШЧЫ*

### Выключная жорсткасьць паліцыі

БЭРЛІН, 2. Першамайскія дэманстрацыі ў Бэрліне абярнуліся ў форменныя вулічныя баі паміж рабочымі і паліцыяй. Барыкадныя і вулічныя баі цягнуліся некалькі гадзін. Па сваім разьмеры і жорсткасьці яны перавышаюць усё, што Бэрліну прышлося перажыць з 1918 году. І ў Вэдынгу і ў Нолькэйне дэманстранты пабудавалі барыкады, каб закрыць паліцэйскім аўтамабілям доступ у гэтыя кварталы. Тады паліцыя пусьціла ў ход бранявікі з кулямётамі, а таксама пражэктары. У Нолькэйне баі працягваліся з 5 да10 гадзін вечара. у Вэдынгу да позьняй ночы. Парэшце пасьля моцнай перастрэлкі паліцыі ўдалося ўзяць барыкады і ачысьціць вуліцы. Лік ахвяр і арыштаваных—вялізны. Ёсьць шмат цяжка параненых ў галаву і ў жывот. Арыштавана звыш тысячы чалавек, у тым ліку шмат жанчын і моладзі.

Сёньня раніцай выпушчаны толькі «Ротэ Фанэ» і дзьве правых газэты.

«Ротэ Фанэ» падае шмат выпадкаў, якія характарызуюць выключную жорсткасьць паліцыі. (ТАСС).

* * *

**БЭРЛІН, 1. Рух мас ва ўсіх раёнах Бэрліну пачаўся ўжо раніцай. Усе пляцы гораду былі заняты таксама раніцой значнымі паліцэйскімі сіламі. Па ўсяму гораду раз'яжджалі моцныя паліцэйскія патрулі. Рабочыя раёны мацюць выгляд асаджанага гораду. З 9-ці гадзін раніцы ў розных раёнах гораду пачаліся дэманстрацыі, якія сілай разганяліся паліцыяй. Аднак, ня гледзячы на разгон паліцыі, дэманстранты зьбіраліся ўноў. У руху ўдзельнічала, па прыблізнаму падліку звыш 100.000 чалавек. Паліцыя дзейнічала ўсюды выключна труба, карыстаючыся гумавымі палкамі, агнястрэльнаю зброяй, а таксама асобнымі аўтамабілямі. Лік ахвяр і арыштаваных покуль ня высьветлены. Зараз ужо вядома, што 8 чалавек забіта і звыш 80 цяжка паранена. Арыштавана, як падаюць, звыш 900 чалавек, у тым ліку дэпутат ляндтагу Шульц.**

**Паліцыя прабралася ў памяшканьне, дзе адбываўся сход бэрлінскіх трубаправодчыкаў, — прыхільнікаў рэвалюцыйнага крыла прафсаюзаў, параніла стрэламі 2-х удзельнікаў сходу. Перад партыйным домам імя Карла Лібкнэхта паліцэйскімі была ўзьнята страляніна) у выніку якой многія паранены, у тым ліку маленькія дзеці. Ва многіх мясцох рабочыя разбройлі паліцэйскіх. У некаторых раёнах дэманстранты спрабавалі затрымаць паліцэйскія грузавікі барыкадамі. Адзін рабочы быў раздушаны насьмерць паліцэйскім аўтамабілем. Скліканыя рэфармістымі прафсаюзныя сходы прайшлі ў сумным настроі.**

* * *

**БЭРЛІН, 3. Агенцтва Вольфа падае: «У чацьвер вечарам у Нэйкельне адбываліся сур'ёзныя сутычкі паміж паліцыяй і камуністымі. Камуністыя пабудавалі шматлікія барыкады, супроць якіх паліцыя дзейнічала бранявікам і кулямётамі. Бойка, у часе якой забіта 3 і 10 чалавек паранена, ночу спынілася.**

* * *

**БЭРЛІН, 2. Становішча ў горадзе к вечару 1-га мая стала надзвычайна напружаным. У рабочых раёнах адбыўся рад сур'ёзных сутычак. Паліцыя павяла наступленьне супроць барыкады, пабудаванай камуністымі на Панк-Штрасэ (Вэдынгу). Баі на барыкадах працягваліся больш гадзіны. Барыкады былі ўзяты толькі з дапамогаю падасьпеўшых паліцэйскіх падмацаваньняў. У іншых частках гораду таксама рабіліся спробы пабудаваць барыкады, аднак, бяз посьпеху. Усходні і паўночна-усходні раёны гораду былі пагружаны ўсю ноч у змрок. У паўночнай частцы гораду і ў Нэйкельні баі працягваліся ўсю ноч. Устаноўлена, што пры асадзе барыкады ў Нэйкельні паліцыя карысталася між іншым і кулямётамі, ўстаноўленымі на браніраваных аўтамабілях.**

**Учора ўвечары за невялікім выключэньнем вячорнія газэты ня выйшлі. Сёньня раніцаю з газэт выйшла адна толькі «Ротэ Фанэ». Яна дае апісаньне ўчарайшых падзей і ўстанаўлівае факты зьвярстваў паліцыі.**

### На крывавую расправу--рабочыя адказваюць палітзабастоўкамі

БЭРЛІН, 2. Першамайскі камітэт і камітэт Бэрлін-Брандэнбургскай арганізацыі кампартыі зьвярнуліся да рабочых Бэрліну з адозвай рабочым прананусцца адказаць на расправу, зробленую ўладаю, масавымі палітзабастоўкамі. Усе прадпрыемствы павінны спыніць работу, пакуль ня будуць выкананы наступныя патрабаваньні: **звальненьне с.-д. паліцэй-прэзыдэнта, адмена асаднага становішча, вызваленьне арыштаваных і пакараньне паліцэйскіх афіцэраў, па віне якіх адбылося праліцьцё крыві.**

Для правядзеньня забастоўкі павінны быць безадкладна абраны камітэты дзеяньня. Прадстаўнікі камітэтаў пакіроўваюцца на агульныя сходы ФЗК, якія адбудуцца 2-га мая вечарам. У знак пратэсту супроць крывавай расправы ў Бэрліне забаставалі два сталяліцейныя заводы Рурскай вобласьці і адна вэрф у Гамбургу. (ТАСС).

### Рабочых-дэманстрантаў абвінавачваюць у мецяжы і забойстве

БЭРЛІН, 2. З арыштаваных учора звыш тысячы чалавек пакінута пад вартай 125 чалавек, сярод якіх ёсьць жанчыны. Па чутках, яны будуць прыцягнуты да адказнасьці па абвінавачаньні ў парушэньні «грамадзянскага міру», мецяжы, забойстве і замаху на забойства. (ТАСС).

### Сацыял-здраднікі стараюцца абяліць сябе

**БЭРЛІН, 1. Увесь нямецкі друк, пачынаючы з сацыял-дэмакратычнай «Форвэртс» і канчаючы крайне-правымі рэакцыйнымі органамі, выступаючы супроць падрыхтоўкі нямецкай кампартыяй першамайскай дэманстрацыі ў Бэрліне, разгарнуў антыбальшавіцкае цкаваньне пад лёзунгам: «Камуністыя дзеючаюць па загаду з Масквы». «Форвэртс», напрыклад, заяўляе, што камуністычная падрыхтоўка да сьвяткаваньня 1-га мая ў Бэрліне распачата па загаду т. Мануільскага, «прысланага для гэтай мэты ў Бэрлін выканаўчым камітэтам Камінтэрну».**

**«Бэрлінэр Тагеблят» лічыць, што паказаньне маскоўскай «Правды» на тое, што адказнасьць за магчымыя вынікі першамайскай дэманстрацыі ў Бэрліне кладзецца не на камуністых, а на іншых»—адносіцца, зразумела да паліцэй-прэзыдэнта Цэргібэля, міністра ўнутраных спраў Завэрынга і наогул нямецкага ўраду». «Падобнае ўмяшаньне ва ўнутраныя справы Нямеччыны,—піша газэта,— павінна быць успрынята тым больш балюча, што хаця «Правда» і не зьяўляецца афіцыяльным урадавым органам, але ўсё-ж яна піша толькі тое, што пажадана для савецкага ўраду».**

### Цэргібэль прабуе апраўдацца

БЭРЛІН, 2. Цэргібэль надрукаваў у «Бэрлінэр Тагеблят» артыкул, у якім ён дарэмна спрабуе растлумачыць, чаму ён не адмяніў забароны дэманстрацый. Ён прыводзіць тры маркаваньні: урадавы крызіс, які зацягнуўся, камуністычная прапаганда пад лёзунгам «Свабода дэманстрацый», перад якой ён ня хацеў адступіць, каб ня страціць прэстыжу ўлады, першамайскія падзеі ў мінулым годзе, калі камуністыя, нібы-та,перашкаджалі дэманстрацыям сацыял-дэмакратычных прафсаюзаў. Апошні аргумэнт даводзіць правільнасьць запэўненьня камуністых, якія заяўляюць, што забароны дэманстрацый дамагаліся рэфармістыя, бо ў гэтым годзе больш ясна, чым у мінулым павінна была высьветліцца перавага ўпливу камуністычнай партыі ў рабочых масах Бэрліну. Наогул-жа аргумэнты Цэргібэля ня вытрымліваць пінкай крытыкі, бо застаецца зусім незразумелым, чаму можна было дазволіць першамайскія дэманстрацыі ў Гамбургу і ў некатарых іншых буйных гарадох, пры чым агульная забарона дэманстрацыі засталася ў моцы і адначасова ўсё абышлося без якіх-небудзь сур'ёзных сутычак.

Наогул «Форвэртс» і буржуазныя газэты, а асабліва дэмакратычныя, спрабуюць скрыць сваё замяшаньне ўзмоцненым антысавецкім цкаваньнем. Адначасова тая-ж буржуазная газэта павінна была прызнаць выключную жорсткасьць паліцыі ў адносінах да дэманстрантаў.

«Бэрлінэр Тагеблят» і «Франкфуртэр Цэйтунг» рэзка крытыкуюць паліцэйскія гвалты, якія рабіліся ня толькі над дэманстрантамі, але і над прахожымі. «Бэрлінэр Тагеблят» падрукаваў расказ свайго рэпарцёра, які быў затрыманы, зьвязаны, пабіты, пасаджаны ў турму пры паліцэй-прэзыдыуме і вызвалены толькі пасьля доўгіх дамаганьняў. Тое-ж самае было і з іншымі буржуазнымі журналістымі, якія прабавалі фатаграфаваць сцэны паліцэйскай расправы.

У панядзелак, 6-га мая, а 6 з паловай гадзіне ўвечары ў клюбе імя Карла Маркса склікаецца

**СХОД ГОРАДЗКОГА ПАРТАКТЫВУ**

ПАРАДАК ДНЯ:

**Вынікі аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і XVI партканфэрэнцыі.**

Дакладчык тав. **Гамарнік.**

Уваход па білетах, атрыманых у РК КП(б)Б. Члены і кандыдаты ЦК, ЦКК, АК, АКК, РК КП(б)Б, члены бюро ЦК і АК ЛКСМ уваходзяць па сваіх пасьведчаньнях.

**Менакругком КП(б)Б.**

### Звыш 100 параненых ў Варшаве

**ВАРШАВА, 2.** 1-га мая ва ўсіх буйных рабочых цэнтрах Польшчы аббываліся крывавыя сутычкі паміж маніфэстантамі і паліцыяй. Асабліва дасканала падрыхтавалася ў гэтым годзе варшаўская паліцыя. Напярэдадні было зроблена некалькі сот вобыскаў і арыштаў. На 1-га мая ў Варшаве было мабілізавана 2.500 пешых паліцэйскіх і 2 эскадроны конпай паліцыі. Паліцыя мела аўтатранспарт. Усё гаварыла аб тым, што ў гэтым годзе паліцыя паставіла задачай ва што-б там ні стала не дапусьціць першамайскіх дэманстрацый камуністых. З гэтай сваёй задачай варшаўская паліцыя не справілася.

Раніцай моцныя атрады паліцыі пачалі разганяць раённыя дэманстрацыі, якія пакіроўваліся на галоўны зборны пункт Гржыбоўскі пляц. Такім чынам было разагнана 8 раённых камуністычных дэманстрацый. Ня гледзячы на гэта па Гржыбоўскі пляц, акружаны з усіх канцоў паліцыяй, сабралася звыш 5.000 дэманстрантаў. Пляц занялі цалкам камуністыя і лявіцца ППС. Былі разгорнуты чырвоныя сьцягі і плякаты. Прамову сказаў камуністычны дэпутат Сыпула.

Пачатак мітынгу паслужыў для паліцыі сыгналам. 2 моцных атрады пешай і коннай паліцыі ўрэзаліся ў масу дэманстрантаў і пачалі іх зьбіваць шашкамі і прыкладамі. Пешай паліцыі дэманстранты аказалі супраціўленьня, зламаць якое ўдалося толькі коннай паліцыі. На пляцы засталося накалькі цяжка параненых. Лік зьбітых і пакалечаных вельмі вялікі. **Сярод зьбітых—дэпутат Сыпула.** У зьбіеньні дэманстрантаў, акрамя паліцыі, прымалі ўдзел таксама шмат патаемных агэнтаў і **паасобныя групы фашысцкіх студэнтаў.** Зьбіеньне дэманстрантаў адбывалася ня толькі па Гржыбоўскім пляцы, але таксама і ва ўсіх рабочых раёнах. Паводле апошніх даных за дзень у сутычках з паліцыяй **было лёгка паранена 100 чалавек, цяжка—9.** Зроблена шмат арыштаў. Арыштаваны дзеяч левай ППС адвакат Грабоўскі, які сказаў прамову на Гржыбоўскім пляцы. Па няпоўных даных, агульная колькасьць рабочых, што выйшла на вуліцу па закліку камуністых, вызначаецца ў 10.000 чалавек.

Пасьля разгрому галоўнай дэманстрацыі, паасобныя працэсіі камуністых і лявіцы ППС дэманстравалі ў рабочых раёнах, дзе зноў мелі мейсца сутычкі з паліцыяй. Пасьля поўдня ў рабочых раёнах арганізаваліся новыя камуністычныя працэсіі. Адна дэманстрацыя дайшла да могілак на Акопавай вуліцы і палажыла вянкі на магілу студэнта-камуністэта Ляпоня, які пядаўна памёр у турме Вронкі. Моцныя нарады пешай і коннай паліцыі патрулявалі ў рабочых раёнах далёка за поўнач, разганяючы паасобныя групы сабраўшых ся рабочых.

**У Макатоўсакай турме,** а таксама ў **турме Павіякі** палітычныя зьняволеныя паладзілі на прагулцы дэманстрацыю з няньнем Інтэрнацыяналу. Некалькі сот рабочых, што сабраліся вакол турмы Павіяк далучыліся да няньня Інтэрнацыяналу палітвязьнямі. Відавочна палітвязьні былі гвалтам загнана ў камэру, бо з турмы доўгі час чуты быў шум Што там адбывалася—невядома.

### У ВІЛЬНІ ПАЛІЦЫЯ АТАКАВАЛА ДЭМАНСТРАНТАЎ

#### Паранена 24 чалавекі

**У ВІЛЬНІ** рабочая дэманстрацыя, якая выйшла на вуліцу са сьцягамі кампартыі Заходняй Беларусі і Грамады была атакавана паліцыяй. Як паведамляюць газэты, дэманстранты аказалі супраціўленьне. У адказ паліцыя дала залп. У выніку сутычкі цяжка паранена 24 чалавекі, у тым ліку 6 паліцэйскіх. Газэты сьцьвярджаюць, што дэманстранты таксама стралялі ў паліцыю. Пры разгоне дэманстрацыі паранены ў галаву дэпутат беларускай рабоча - селянскай фракцыі сойму **Дварчанін.** Адзін з параненых удзельнікаў дэманстрацыі вечарам памёр.

### Ганебны правал ППС у Лодзі

ППС у гэтым годзе не наладжвала ў Варшаве дэманстрацыі і абмежавалася мітынгамі ў розных пунктах гораду, на якія прыбыло ад 2-х да 3 тысячы чалавек. Пэпэсэсаўская дэманстрацыя ў Лодзі скончылася ганебным правалам. Варшаўскія дэманстрацыі Бунду і Паалей-Цыён выйшлі зусім мізэрнымі і палічвалі разам ня больш 2-х тысяч чалавек.

### Мізэрная дэманстрацыя „палкоўніцкіх малойчыкаў"

Пры садзейнічаньні ўлады дэманстравала партыя Яваро́ўскага (правая ППС). Яваро́ўцы занялі ў гэтым годзе Тэатральны пляц. У іх працэсіі прымала ўдзел да 4-х тысяч чалавек, з іх палова дружыньнікаў. Працэсія Яваро́ўскага склалася, галоўным чынам, з рамесьнікаў і камунальных работнікаў, якія залежаць ад магістрату. Працэсія адбывалася на чале з Яваро́ўскім, агалашаючы лёзунгі ў гонар Пілсудзкага. Аркестр бесьперабойна выконваў гімн пілсудчыкаў «Першая брыгада».

Пэпэсэсаўскі «Роботнік» цьверджыць, што для паданьня большай павагі працэсіі яваро́ўцаў на Тэатральны пляц былі накіраваны члены саюзу «Стралец» у звычайнай вопратцы. (ТАСС).

### У Львове паранен дэпутат Вальніцкі

**У ЛЬВОВЕ** пры разгоне першамайскае працэсіі паліцыя пабіла шмат дэманстрантаў. Лёгкае параненьне атрымаў дэпутат аб'яднанага сельробу **Вальніцкі.**

**У ЛОДЗІ** камуністычная парцэсія была разагнана атрадамі коннай і пешай паліцыі.

**У Барыслаўлі** пры разгоне рабочае працэсіі лёгка паранен дэпутат аб'яднанага сельробу **ГАМ.**

**У БЕЛАСТОКУ** паліцыя разагнала мітынг, на якім выступаў дэпутат рабоча-селянскай беларускай фракцыі сойму **Гаўрылік.** Разагнаны быў таксама мітынг у Дамброве, на якім выступаў камуністычны дэпутат **Кэрузальскі.**

**У ЛЮБЛІНЕ** конная паліцыя разагнала дэманстрацыю левай ППС і Сялянскай Узаемадапамогі, на чале якой быў дэпутат Вайтовіч. З правінцыі адусюль паведамляюць аб шматлікіх арыштах, у зьвяку з першамайскімі дэманстрацыямі.

### Новая вылазка расійскіх белагвардзейцаў у Варшаве

ВАРШАВА, 2. 1-га мая раніцай група п'яных расійскіх белагвардзейскіх студэнтаў в 11 чалавек, якая выйшла, як відаць, з начнога шынку, падыйшла да будынку паўпрэдзтва СССР і засьпявала «боже царя храні». Пасьля дэманстрацыі паліцыя разагнала белагвардзейцаў.

### Фашысцкая „падрыхтоўка" да 1 мая

ВАРШАВА, 1. Як інтэнсыўна вялася польскім фашызмам «падрыхтоўка» да першага мая на ўсім абшары Польшчы, сьведчыць ніжэйшая няпоўная зводка вестак з польскага буржуазнага друку за апошнія два-тры дні:

У паветах Радзынскім, Бяльскім і Канстантынаўскім (Люблінскае ваяводзтва) праведзены масавыя арышты і вобыскі сярод западозраных у прыналежнасьці да кампартыі. У Яначе-Падляскім выкрыты райком камсамолу. У Білай-Падляскай і ў Канстантынаўскім павеце арыштавана 30 чалавек, у Мендзыжэчы--5, у Любіне—22 («Гл. Пр.»).

У Варшаве ў памяшканьні ППС-лявіцы арыштавана 30 чалавек. Канфіскавана 6.000 брашур, («Гл. Пр.»).

У Радоме таксама адбыліся масавыя вобыскі. Арыштавана некалькі чалавек. («К. Вар.»).

У Верхняй Сілезіі масавыя вобыскі і арышты праведзены ў паветах: Катовіцкім, Каралеўска-Гуцкім, Сьвентахловіцкім і Пшчынскім. Канфіскавана шмат камуністычнае першамайскае літаратуры. У Каралеўскай гуце зноўдзены матрыцы для друкаваньня адозваў. Арыштавана 19 чалавек. («К. Варш.»).

У Радашковічах, Вялейскага павету, арыштавана 9 чалавек, западозраных у прыналежнасьці да мясцовае камуністычнае арганізацыі. («К. Варш.»).

У раёне Старашчына, Валейскага павету, арыштавана двое па падазрэньні ў прыналежнасьці да кампартыі («Сл.»).

### Першамайская дэманстрацыя ў Вене

ВЕНА, 1. Першамайская дэманстрацыя ў Вене прайшла без інцыдэнтаў. У дэманстрацыі, арганізаванай аўстрыйскай кампартыяй, удзельнічала некалькі тысяч чалавек, у тым ліку атрады чырвонай рабочай абароны, а таксама левае апазыцыйнае крыло сацыял-дэмакратычнай партыі, якое пастанавіла на антыфашысцкім кангрэсе дэманстраваць 1-га мая пад лёзунгамі кампартыі. Толькі ў Кэпцэнбэргу адбыліся сутычкі паміж членамі с.-д. «шуцбунду» і членамі фашысцкай арганізацыі, у часе якіх паранена 19 чалавек.

### Надзвычайныя меры супроць першамайскіх дэманстрацый у Парыжы

#### 3.400 арыштаваных ў Парыжы

ПАРЫЖ, 1. Агэнцтва Гавас паведамляе: «1-га мая ў Парыжы і ў ваколіцах было зусім спакойна. У якасьці мер папярэджаньня паліцыя арыштавала ўсіх правадыроў, здольных выклікаць хваляваньні, а таксама ўсіх актыўстых, якія спрабавалі вывесьці рабочых на вуліцу. Затрымліваліся таксама прадаўцы першамайскай газэты, выпушчанай узамен «Юманітэ», усе выданьні якой канфіскаваны. Сярод 3400 арыштаваных шмат камуністычных кіраўнікоў і 350 чужаземцаў. Арыштаваны таксама камуністычны дэпутат Дорыё. (ТАСС).

* *

ПАРЫЖ, 1. Як падае друк, з мэтай недапушчэньня вулічных першамайскіх дэманстрацый у дапамогу паліцыі ў Парыж перакінуты значныя атрады рэспубліканскай гвардыі. Першамайскі нумар «Юманітэ», у якім былі зьмешчаны між іншым, адозвы французкай кампартыі, унітарнай федэрацыі працы і камітэту МОПР'у—канфіскаваны. Паводле афіцыйных вестак, першамайская забастоўка ў Парыжы ахапіла ў сярэднім каля 60 проц. усіх прамысловых прадпрыемстваў Парыжу. Газавы завод, электрапрадпрыемствы, чыгункі, мэтрапалітэн, трамваі і аўтабусы амаль не закрануты забастоўкай. Гарнякі, наадварот, бастуюць амаль усе. Шмат мітынгаў. намечаных унітарнымі прафсаюзамі, не маглі адбыцца з прычыны надзвычайных мер, прынятых паліцыяй. Як падаюць газэты, у мясцовасьцях каля Парыжу першамайская забастоўкай спынена ў сярэднім каля 75 проц. ўсіх прамысловых прадпрыемстваў. (ТАСС).

* *

ПАРЫЖ, 2. У правінцыі 1-ае мая сьвяткавалася паўсюды. У Марсэлі адбылася вялікая дэманстрацыя. Звыш 7000 рабочых прайшлі па галоўных вуліцах гораду з разгорнутымі сьцягамі і плякатамі. У ноч на 1-ае мая на шпіцы сабору, вышынёй у 70 мэтраў, былі вывешаны 2 чырвоныя сьцягі, якіх не ўдалося зьняць аж да вечара.

У Лілі адбыўся мітынг на біржы працы. Удзельнічала 4000 чалавек. Паліцыя рабіла спробу разагнаць мітынг. Некалькі рабочых паранена і арыштавана.

У Лансэ рабочыя пасьля гадзіннай барацьбы з паліцыяй прабіліся ў цэнтр гораду. Потым у муніцыпальным залі адбыўся шматлюдны мітынг. У Лансэ праведзены арышты. Між іншымі, арыштаваны сакратар мясцовай унітарнай федэрацыі. У іншых гарадох адбіваліся вялікія вулічныя дэманстрацыі і мітынгі. Маюцца весткі, што рабочыя басаставалі амаль цалкам у Тулузе, Марсэлі, Конкарно, Лярошэлі, Дюнкірхэне, вугальных басэйнах, а таксама у тэкстыльных округах і іншых мясцовасьцях.

У Брусэлі ня гледзячы на забарону, адбылося камуністычнае рабочае шэсьце.

* *

ПАРЫЖ, 2. Ня гледзячы на ўсе папярэднія захады паліцыі, у прыватнасьці арышты (афіцыйна 2400, па вестках «Юманітэ»—5000), у гарадзкім раёне адбыўся трохтысячны мітынг. Замест арыштаванага дакладчыка (кандыдата рабоча-сялянскага блёку на муніцыпальных выбарах Шонэля) выступалі Кашэн і Тусуэн, якія пратэставалі супроць рэпрэсый. Больш мітынгаў у Парыжы не маглі адбіцца, бо былі арыштаваны прамоўцы і затрымліваліся рабочыя, якія стараліся прайсьці ў памяшканьне сходу. У ноч на 2-ое мая большасьць затрыманых французскіх грамадзян была вызвалена. Затрыманыя чужаземцы, лікам каля 350, знаходзяцца пад арыштам.

### Баі ў Бэрліне працягваюцца

(Начное радыё)

БЭРЛІН, 1. Паліцэй-прэзыдэнт Цэргібэль закрыў на 3 ты дні орган кампартыі «Ротэ Фанэ».

Крывавыя баі на вуліцах Бэрліна працягваюцца яшчэ больш жорстка, чым у першы дзень. Галоўнай арэнай баёў зьяўляюцца рабочыя раёны Нэйкэльн і Вэдынг. Паліцыя не змагла ўзяць ў барыкадным баі галоўную вуліцу Нэйкельна--Гэрманштрасэ, пакінуўшы гэтую «апэрацыю на другі дзень.

Па ўсіх заводах праводзіцца мабілізацыя рабочых мас пад лёзунгамі: «Далоў стан аблогі», «выдаленьне паліцыі з рабочых кварталоў», «далоў Цэргібэля»..

### „10 год Бэрлін ня бачыў такіх рэвалюцыйных боек

БЭРЛІН, 2. Камэнтыруючы першамайскія крывавыя падзеі ў Бэрліне, сёньняшняя «Ротэ Фане» піша:

«Цэргібэль настаяў на сваім, сацыял-дэмакраты дабілася чаго жадала. Іх рукі, аблітыя крывёю Лібкнэхта, Розы Люксэмбург і спартакаўцаў, ізноў абліліся крывёю рабочых. Стрэламі ў галаву і жывот, сьмяротным тэрорам рабочым Бэрліну дадзен вурок, якою буржуазная дэмакратыя ёсьць на справе. Разам з тым, учарашні дзень быў днём рэвалюцыйных боек, якіх Бэрлін ня бачыў ужо 10 гадоў. З гордай рашучасьцю і бяспрыкладным муствам працоўныя Бэрліну зламалі агідную забарону дэманстрацыі. Рабочыя пасьледвалі закліку кампартыі і больш двухсот тысяч іх прайшло па вуліцах гораду, застаючыся пад адкрытым небам з самае раніцы да паступленьня цемры. Разганяямыя Цэргібелеўскімі казакамі, яны зноў зараз-жа зьбіраліся і выступалі яшчэ больш згуртавана. Вуліцы чарнелі народам, і бэрлінскі пралетарыят паказаў, што ён можа змагацца. Больш чым у 6 мясцох стыхійна ўзьнікалі барыкады. Ведынг абярнуўся ў рэвалюцыйнае сэрца Бэрліну. А ў Нэйкельне барыкадныя бойкі працягваліся цэлымі гадзінамі. З дапамогаю Цэргібеля наступае фашызм, каб устанавіць сваё крывавае панаваньне ў Нямеччыне. Першамайская страляніна павінна прагучэць магутным трывожным сыгналам. Крывавы вурок даводзіць, што толькі ўзбраеньне пралетарыяту, разбраеньне контр-рэвалюцыі і ў станаўленьне пралетарскай дыктатуры могуць гарантаваць рабочым чалавечае існаваньне і наогул жыцьцё.

#### Бурныя сцэны ў рэйхстагу

БЭРЛІН, 2. Сёньняшняе пасяджэньне рэйхстагу адзначылася бурнымі сцэнамі—водгукам па крывавыя падзеі 1-га мая. Пасяджэньне адчыніў ня Лебэ, а яго намесьнік—нацыяналісты Грэф. Камуністыя сустрэлі яго крыкамі: «Куды схаваўся казацкі атаман сацыял-дэмакрат Лебэ?». Камуністы Пік дамагаўся безадкладнага абгаварэньня камуністычнага патрабаваньня аб адмене забароны дэманстрацый і рэзка крытыкаваў дзейнасьць паліцыі ў прыватнасьці Цэргібеля. Камуністычня дэпутаты ня раз заклікаліся да парадку за выкрыкі з месц. Патрабаваньні камфракцыі, высунутыя Пікам, былі адхілены. У адказ камуністычныя дэпутаты наладзілі шумную маніфэстацыю і Штэкэр заявіў, што ў знак пратэсту, камфракцыя не будзе ўдзельнічаць у далейшых дэбатах. У сьлед за гэтым камфракцыя ў поўным складзе, пад гукі Інтэрнацыяналу і воклічы: «Прэч забойцаў» пакінула залю пасяджэньняў.

### Першамайскія дэманстрацыя ў Гэльсынгфорсе

ГЭЛЬСЫНГФОРС, 2. Ня гледзячы на дрэнная падвор'е ў першамайскай дэманстрацыі левых рабочых удзельнічала звыш 7 тысяч чалавек, с.-д. дэманстрацыя не адбылася. (ТАСС).

### Першамайская забастоўка ў Коўні

КОЎНЯ, 2. Ня гледзячы на забарону сьвяткаваньня першага мая, друкарні і фабрыкі ў Коўні ў гэты дзень не працавалі. (ТАСС).

### Шматлюдная дэманстрацыя левых рабочых ў Рэвелі

РЭВЭЛЬ, 2. 1-га мая сацыял-дэмакраты арганізавалі ў Рэвэлі дэманстрацыю, па якой было мала народу. Больш шматлюдная была дэманстрацыя левых рабочых, якія паладзілі працэсію са сьцягам і лёзунгамі.

### Першае мая ў Лёндане

ЛЕНДАН, 1. Арганізацыі ангельскай рабочай партыі байкатуюць першамайскія дэманстрацыі. Аднак, рэвалюцыйныя рабочыя Лёндану арганізавалі шэствіе. На чале 5.000 дэманстрацый ішлі атрады рабочага саюзу—удзельнікаў сусьветнай вайны. Дэманстранты несьлі шматлікія сьцягі і плякаты з лёзунгамі салідарнасьці з рабочымі СССР, барацьбы супроць белага тэрору ў Індыі, супроць пагроз імпэрыялістычнай вайны і г. д. Шэствіе ўсюды суправаджалі ворагі вымушаны прызнаць, што Савецкі Саюз зьяўляецца фактарам міру. Што датычыцца Польшчы, дык пасьля некаторых нядаўніх выступленьняў увесь сьвет мог пераканацца, якія авантурыстцкія элемэнты зьяўляюцца кіраўнікамі сучаснай Польшчы.

У Польшчы зараз уяляа ўладу ў свае рукі група, дзейнасьць якой прадстаўляе простую небясьпеку для міру і спакою ў Эўропе. Таму тое, што адбываецца ў Польшчы, павінна прыцягнуць усеагульную ўвагу. Польскі мілітарызм павінен быць выкрыты і ізаляваны.

(«ІЗВЕСТИЯ»).

### Першамайская дэманстрацыя ў Празе

ПРАГА, 1. У першамайскай дэманстрацыі калёна чэха-славацкай кампартыі адрозьнівалася яскрава пралетарскім складам і рэвалюцыйнымі характарам. Камуністычная калёна, у якой было 20.000 чалавек перавышала па колькасьці калёну сацыял-дэмакратаў. Пад сьцягамі кампартыі дэманстравала вялікая колькасьць беспартыйных рабочых. На месцы збору камуністычнай калёны ў часе шэствія паліцыя мабілізавала ўсе сілы, канфіскавала плякаты з лёзунгамі супроць вайны і фашызму і ва СССР у прыватнасьці патрэт Леніна, яўна правакуючы сутычку. Кіраўнікі кампартыі ледзь устрымлівалі масы ад схваткі з паліцыяй, якая зрабіла некалькі арыштаў.

# ПЛЯНЫ ПОЛЬСКІХ МІЛІТАРЫСТЫХ

## АНТЫСАВЕЦКАЯ КАМПАНІЯ „ГЛОСУ ПРАВДЫ"

ВАРШАВА, 28. **«Глос Правды»** у зьвязку з савецкім праектам разбраеньня выступіў з артыкулам, у якім заяўляе, што савецкія пацыфісцкія праекты прадстаўляюць сабой яскравае крывадушша. «Калі СССР—піша газэта—хоча сапраўднага разбраеньня, дык няхай ён вывядзе свае войскі з Украіны, Туркестану і Каўказу. Пакуль маскоўскі пацыфізм будзе ўтрымліваць заваяваныя нярускія краіны, да таго часу на Усходзе будзе існаваць небясьпека вайны».

ВАРШАВА, 29. **«Глос Правды»,** працягваючы сваю антысавецкую кампанію, заяўляе, покуль у склад СССР уваходзяць Украіна, Каўказ, і Сярэдняя Азія, ня можа быць і гутаркі аб міры на Ўходзе. Далей газэта разважае на тэму аб магчымасьці вайны, якая будзе выклікана СССР. Па думцы газэты, урад СССР, жадаючы знайсьці выхад з унутраных затрудненьняў, можа ўхапіцца за апошні сродак, якім зьяўляецца ваенная авантура. Усё-ж газэта схільна меркаваць, што пры сучасным становішчы рэчаў небясьпека вайны з боку СССР мінімальная.

* *

Тое, аб чым адкрыта гаворыць «Глос Правды»—польскі афіцыёз даводзіць, што сярод палкоўніцкай групы, у руках якой згрупавана зараз уся ўлада ў Польшчы, моцна жывуць мары, аб перакройцы карты Усходняй Эўропы. Мір у гэтай частцы Эўропы, па думцы кіруючай польскай групы, нямыслімы без падзелу Савецкага Саюзу. Аднак, такая асноўная лінія замежна-палітычнай праграмы цяперашніх кіраўнікоў польскай рэспублікі ня можа застацца толькі чыста абстрактнай.

У сучасны момант увесь польскі друк з абурэньнем атакуе тую частку нарыскага мэмарандуму. Шахта, у якой нямецкі дэлегат заяўляў аб неабходнасьці зьмены граніц, праведзеных вэрсальскім мірам паміж Польшчай і Нямеччынай. Увесь польскі друк згодзен з тым, што такая зьмена магчыма толькі ў выніку польска-нямецкай вайны, і што ўзьнімаць гэтае пытаньне—значыць імкнуцца да вайны. Такой-жа думкі ў гэтым пытаньні трымаўся заўсёды і «Глос Правды». Аднак, у таго-ж афіцыйнага органу ня ўзьнікае ніякіх сумненьняў, калі ён выступае з плянам ня больш, ня менш, як падзелу ўсяго Савецкага Саюзу.

Трудна лічыць, каб нават пры надўнасьці самай вялікай фантазіі ў палітыкаў гэтага лягеру магла ўзьнікнуць ідэя, што ажыцьцяўленьне такога пляну магчыма мірным шляхам.

Мы можам ужо канстатаваць тыя вынікі, якія прынесла гэта базадказная палітыка як для самой Польшчы, так і для саюзна-польскіх адносін. Польшча ў сучасны момант уступае ў паласу мацнейшага эканамічнага крызісу. Зразумела, гэты крызіс у пэўнай меры абумоўліваецца прычынамі агульнага парадку. Але ў вельмі значнай ступені цяжкі стан польскае народнае гаспадаркі тлумачыцца палітыкай мілітарысцкіх колаў, якія імкнуцца прыстасаваць польскую эканоміку для падрыхтоўкі да новай вайны. Калі ўспомніць, на якіх слабых юрыдычных і перш за ўсё фактычных асновах трымаецца польская ўлада над Заходняй Украінай і Заходняй Беларусіяй,—дзе Польшча вымушана да гэтага часу захоўваць рэжым ваеннай акупацыі,—на цяжка ўявіць

16-я УСЕСАЮЗНАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ

# ПРАМОВА т. М. М. ГАЛАДЗЕДА

## У спрэчках па дакладу

## „Пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі"

Таварышы як дакладчыкі, так і наступныя прамоўцы ў спрэчках зусім правільна характарызавалі пяцігодку, як вынік вялізнай і напружанай работы вялікага калектыву гаспадарчых, пляновых і палітычных працаўнікоў. Таксама правільна і тое, што пяцігодка зьяўляецца вялікім дасягненьнем пралетарыяту на шляху да сацыялізму. Калі XV зьезд па дакладу аб пяцігодцы даў асноўныя генэральныя ўстаноўкі на бліжэйшыя пяць год, дык сапраўдны праект тэзісаў, які прадстаўлен на разгляд канфэрэнцыі, уключае ў сабе канкрэтныя лічбовыя ліміты, якімі азначаецца ахват і тэмп будаўніцтва для важдейшых галін народнае гаспадаркі. У пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі, бязумоўна, канцэнтруюцца асноўныя пытаньні палітыкі партыі на поўны адмежак часу, г. зн. канцэнтруецца эканамічная палітыка партыі. Таму пры разглядзе пяцігадовага пляну нам неабходна падпарадкаваць яго крытыцы і даць яму ацэнку з пункту погляду адпаведнасьці яго генэральнай лініі і палітыцы нашае партыі. Да пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі СССР мы павінны прад'явіць наступныя патрабаваньні: ці поўнасьцю ён, вынікаючы з тых магчымасьцяй і тых патрэбнасьцяй, якія ў нас ёсьць (а магчымасьці ў нас ёсьць вялізныя), адказвае на лёзунг індустрыялізацыі Савенкага Саюзу, ажыцьцяўляючы гэту індустрыялізацыю максымальна напружаным тэмпам; ці адлюстраваны курс на пасьлядоўнае і рашучае наступленьне сацыялістычных элемэнтаў па прыватна-капіталістычныя элемэнты. Да асноўных установак нашае партыі адносяцца таксама і такія пытаньні, як усямернае ўзмацненьне кіруючай ролі пралетарыяту ва ўсёй сыстэме народна-гаспадарчага будаўніцтва, павышэньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочых мас і бядняцка-серадняцкага сялянства, а таксама ці даволі адлюстраваны ў пяцігодцы задачы карэннага сацыялістычнага пераўтварэньня сельскае гаспадаркі на базе калектывізацыі і вытворчага каапэраваньня.

Вось, памойму, галоўнае і асноўнае, што павінна быць адлюстравана ў канкрэтных лімітах тэй пяцігодкі, якую мы разглядаем. Калі ўзяць галоўныя паказальнікі, паданыя ў матар'ялах Дзяржпляну і ў тэзісах, прадстаўленых на разгляд канфэрэнцыі, дык можна бязумоўна зрабіць станоўчую ацэнку таго пляну, які прадстаўлен нам на разгляд. Аднак, у далейшым, пры канчатковым карэктаваньні канкрэтнага пляну, прыдасьцца Дзяржпляну Саюзу і ЦК УсеКП(б) унесьці ў яго цэлы рад карэктыў практычнага парадку.

У прыватнасьці, калі паставіць пытаньне, наколькі плян здаральне тэй дырэктыве, якая была дана XV-м зьездам УсеКП(б) аб падцягваньні, г. зн. уздыме эканомікі адсталых нацыянальных рэспублік, дык у гэтай частцы пляну патрэбны будуць бяспрэчна практычныя карэктывы. У пляне ў асноўным правільна намечана ўстаноўка на ўздым эканомікі і культуры адсталых нацыянальных рэспублік. Гэта лінія ў парадку выкананьня дырэктыў XV зьезду Дзяржплянам праводзіцца. Але, бязумоўна, пры канчатковым зьвярстаньні пляну і асабліва пры складаньні гадавых пляноў, г. зн. гадавых кантрольных лічбаў, нашым плянуючым органам прыдасьцца ўносіць цэлы рад практычных паправак у бок узмацненьня, галоўным чынам, прамысловага будаўніцтва адсталых нацыянальных рэспублік. У прыватнасьці, я асабіста лічу, што ў адносінах Беларускай рэспублікі неабходна будзе пры канчатковым зьвярстаньні пляну ўнесьці цэлы рад паправак у бок узмацненьня прамысловага будаўніцтва для таго, каб на крайнім захадзе Савецкага Саюзу ўсё больш і больш шпаркім тэмпам узмацніць пралетарскую базу, г. зн. тую базу, якая будзе асноўнай сілай на граніцы Савецкага Саюзу.

Мы ў рэспубліцы паставілі перад сабою сур'ёзную праблему індустрыялізацыі БССР у адпаведнасьці з агульнасаюзнымі задачамі, г. зн. паставілі перад сабою задачу ўзмацненьня ўдзельнае вагі прамысловай прадукцыі ў агульнай прадукцыі рэспубліканскае гаспадаркі. У нас дагэтуль удзельная вага прамысловай прадукцыі ў адносінах прадукцыі сельскае гаспадаркі зьяўляецца зусім нізкай, невыстарчальнай. Мы ў гэтай пяцігодцы ставім праблему прамысловага будаўніцтва па лініі арганізацыі мэталяапрацоўчай прамысловасьці, па сярэднім машынабудаўніцтве, варштатабудаўніцтве і сельска-гаспадарчым машынабудаўніцтве.

Умовы і магчымасьці для разьвіцьця гэтага тыпу прамысловасьці ў нас ёсьць вялізныя. Апрача таго, мы ставім пытаньне аб разгортваньні прамысловасьці, якая працуе на лясным сыр'ё, галоўным чынам у галіне складаных пераапрацоўкі драўніны і па лініі лесахэмічнай прамысловасьці.

Мы паставілі яшчэ праблему разьвіцьця гарбарнай прамысловасьці, запалкавай, харчаапрацоўчай, папяровай і г. д., і трэба сказаць, што калі ў асноўным намячэньні ў нас в Дзяржплянам няма вялікіх разыходжаньняў, дык у аб'ектах гэтага будаўніцтва разыходжаньні ёсьць значныя. Я ня буду пералічваць гэтых канкрэтных недагаворанасьцяй з Дзяржплянам Саюзу, але нельга, напрыклад, абыйсьці такое пытаньне, як арганізацыя прадпрыемстваў па выпрацоўцы прычэпных прыладаў, г. зн. прычэпных машын для шляхавага будаўніцтва і асваеньня мэліяраваных балот. У гэтых адносінах з боку Дзяржпляну СССР справа зводзіцца да разважаньняў аб арганізацыі майстэрань. Зразумела, мы ня можам з гэтым згадзіцца.

Наогул, у нас ёсьць разыходжаньні па пытаньні аб будаўніцтве прадпрыемстваў тыпу лёгкай індустрыі, паколькі мэталюргічнай цяжкой індустрыі мы ў гэтай пяцігодцы ня маем магчымасьці праектаваць.

Патрэбнасьці сельскае гаспадаркі ў пляне, памойму, таксама ня зусім улічаны. Возьмем такую важную для Беларусі праблему, як праблема мэліярацыі. У нас аграрнае перанаселеньне пераважае амаль усе раёны Саюзу, асабліва, калі прыняць пад увагу ня толькі шчыльнасьць насельніцтва на 1 кв. клм., але і ўрадлівасьць глебы, бо мы маем значны процант забалочаных сельска-гаспадарчых плошчаў. Такім чынам, для ліквідацыі аграрнай перанаселенасьці, для зьнішчэньня беспрацоўя, праблема мэліярацыі ў нашай пяцігодцы павінна адыгрываць першачарговую ролю. Калі мы ў ахвяце намечаных мерапрыемстваў ня маем вялікіх разыходжаньняў з Дзяржплянам СССР, дык у вызначэньні асыгнаваньняў для плошчаў, якія мы мяркуем мэліяраваць, у нас ёсьць разыходжаньні, якія вымяраюцца дзесяткамі мільёнаў рублёў.

Справа ў тым, што Дзяржплян Саюзу выходзіць з тых меркаваньняў, што ўкладаньні на асваеньне мэліяраваных плошчаў, якія ўцягваюцца ў сельска-гаспадарчы зварот, павінны вымярацца звычайнымі нормамі. Аднак, дзесяціна балота, на якой праводзіцца мэліярацыя, патрабуе вялікіх сродкаў, больш буйных укладаньняў для таго, каб уцягнуць яе ў гаспадарчы зварот і атрымаць больш сур'ёзны эканамічны эфэкт. Памойму, у Дзяржпляну СССР значны недаўлік гэтых спэцыфічных асаблівасьцяй.

Апрача таго, мне думаецца, што ня толькі для Беларусі, але і для ўсяго Саюзу трэба паставіць больш радыкальна праблему навукова-дасьледчай работы па ўжываньні і скарыстаньні торфу. Пытаньне аб скарыстаньні торфу, як сур'ёзнай энэргетычнай базы, як базы сырцовай, адыгрывае буйнейшую ролю.

У пяцігодцы Дзяржпляну гэта пытаньне ставіцца, але ў зьвязку з тым, што ў нас бязумоўна будзе дэфіцыт апалу і што, значыцца, каменным вугалем і нафтаю нам ня вырашыць поўнасьцю задачу індустрыялізацыі СССР, таму нам сур'ёзна трэба заняцца пытаньнем скарыстаньня торфу, як апалу, і галоўным чынам пытаньнем аб хэмічнай яго пераапрацоўцы. Мне думаецца, пры канчатковай пабудове пяцігодкі гэтыя канкрэтныя недаапрацаваныя поўнасьцю часткі неабходна падпарадкаваць далейшаму выпрацоўленьню.

У заключэньне я спынюся на пытаньні аб якасных паказальніках пяцігодкі. Для пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі сур'ёзную ролю будзе адыгрываць пытаньне аб выканаваньні прапанаваных вызначэньняў у галіне якасных паказальнікаў, накшталт зьніжэньня на 35 проц. сабекошту, павышэньня прадукцыйнасьці працы, зьніжэньня будаўнічага індэксу. Гэтыя-ж процанты ўжо ўлічаны намі, як гатоўка. Значыцца, калі пры правядзеньні адпаведных работ мы ня выканаем іх, мы можам рызыкаваць скараціць ахват усіх нашых мерапрыемстваў.

Некалькі заўваг у галіне сельскае гаспадаркі. Я лічу, што цэнтрам увагі ўсёй партыі павінна быць пытаньне калгаснага і саўгаснага будаўніцтва. Мне думаецца, што нам гэту частку ўздыму сельскае гаспадаркі (калектывізацыю і саўгаснае будаўніцтва) трэба ўзяць пад асобны нагляд, выдзеліць, як асобна важную рашаючую задачу, і рызначыць штодзённы нагляд з боку партыйных арганізацый за практычнай работай па калектывізацыі. Тая акалічнасьць, што да канца пяцігодкі мы будзем мець у год 400 мільёнаў пудоў таварнага хлеба ад сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі, гаворыць за тое, што мы будзем мець усё неабходнае і асноўнае для таго, каб весьці пасьляхова барацьбу з кулацтвам за хлеб. Таму гэту частку пяцігодкі трэба ўсім партарганізацыям выдзеліць пад спэцыяльны нагляд А галоўнае, мы павінны арганізацыйна ахапіць і абслужыць той калгасны рух, які ў нас ёсьць у краіне. Трэба таксама абслужыць калгасы, што растуць, сродкамі вытворчасьці (машыны, сельгаскрэдыт і г. д.).

Важнай умовай выкананьня пяцігодкі зьяўляецца таксама пытаньне аб якасьці нашай практычнай работы, пытаньне аб падрыхтоўцы кадраў гаспадарнікаў, у першую чаргу гаспадарнікаў-арганізатараў і кадраў кваліфікаваных спэцыялістых. Нам на XVI партыйнай канфэрэнцыі трэба адзначыць, што зусім правільна зрабіў пленум ЦК УсеКП(б) у ліпені 1928 году, калі частку ВТНУ выдзеліў у асобную групу, на асобнае становішча. Нам трэба ўжыць меры для таго каб гэта выдзяленьне ВНТУ на асобнае становішча было апраўдана.

Пытаньне падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы павінна падпарадкавацца далейшай дапрацоўцы, яно яшчэ невыстарчальна распрацавана ў нашай пяцігодцы.

Пытаньні інтэнсыўнасьці працы, павышэньня прадукцыйнасьці працы і працоўнай дысцыпліны будуць таксама мець сур'ёзнае значэньне.

Трэба, памойму, выдзеліць асобна пытаньне разгортваньня рацыяналізатарскай работы. Да гэтага часу ў нас толькі гаворыць аб рацыяналізатарскай рабоце. Я лічу, што пытаньне аб рацыяналізацыі ў сувязі з пяцігадовым пляном трэба паставіць у спэцыяльны плян, каб ён быў неадлучнай часткай пяцігодкі, інакш у пытаньні рацыяналізацыі застануцца толькі адны гутаркі, а выканаць гэты пяцігадовы плян бяз гігантскае работы па рацыяналізацыі ўсяго нашага будаўніцтва і кіраўніцтва мы ня зможам.

Павінен адзначыць яшчэ пытаньне аб тым, што мы за апошні час зусім амаль перасталі гаварыць аб якасьці выпрацоўваемай намі прадукцыі. Мы не завастраем увагі на гэтым пытаньні ў адпаведнай меры, а трэба сказаць, што ў гэтай частцы ў нас яшчэ ёсьць шмат недахопаў.

Самае асноўнае, што павінна быць рашаючай умовай і сродкам па выкананьні пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, гэта барацьба з тымі труднасьцямі, якія мы маем на гэтым шляху, а таксама барацьба з тымі панікёрскімі настроямі, якія нараджаюцца на глебе гэтых труднасьцяй.

Самае асноўнае і рашаючае, гэта нам трэба пры ажыцьцяўленьні пяцігадовага пляну паставіць рашучым чынам і праводзіць напружаную барацьбу з правым апартуністычным ухілам у нашай партыі і з прымірэнцамі, г. зн. барацьбу з правай небясьпекай і з усімі тымі, хто перашкаджае партыі мабілізаваць увагу рабочае клясы на перамогу труднасьцяй і на пасьпяховае выкананьне пастаўленых задач па сацыялістычным будаўніцтве.

# ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

# ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЧЫСТКІ ПАРТЫІ

## ЧЫСТКА ПАРТЫІ ПАВІННА УЗМАЦНІЦЬ ЯЕ МАБІЛІЗАЦЫЙНУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ У СПРАВЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ, ЯШЧЭ БОЛЬШ УЗМАЦНІЦЬ ДАВЕР'Е ДА ПАРТЫІ І АУТАРЫТЭТ ЯЕ, ПРЫЦЯГНУЦЬ НА ЯЕ БОК ПРАЛЕТАРСКІЯ І БАТРАЦКІЯ ПЛАСТЫ ГОРАДУ І ВЁСКІ

(З рэзалюцыі XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі)

## Праверым партыйныя рады

### З дакладу тав. Е. ЯРАСЛАЎСКАГА на XVI партканфэрэнцыі

### Чаму мы прыступаем да чысткі?

Слова атрымлівае тав. Яраслаўскі для дакладу аб праверцы і чыстцы радоў партыі.

— мы маем,—кажа тав. Яраслаўскі, —пастанову лістападаўскага пленуму ЦК аб чыстцы і праверцы радоў партыі. Тэзісы аб чыстцы даўно апублікаваны і абмяркоўваюцца на мясцох. Таксама разасланы на месцы інструкцыя аб чыстцы. На канфэрэнцыі адбылася нарада працаўнікоў кантрольных камісій па пытаньнях чысткі. Сям-там прароблена ў асноўным уся падрыхтоўчая работа чысткі. Можна было, бадай, абыйсьціся і без дакладу, калі-б ужо ў часе самой падрыхтоўкі да чысткі сям-там ня мелі месца выпадкі скажэньня лініі партыі ў пытаньнях чысткі.

Чаму мы прыступаем да чысткі і праверкі сваіх радоў? Трэба дакладна ўмовіцца, што **асноўнай задачай чысткі зьяўляецца ўмацаваньне партыйных радоў і мабілізацыя іх для ажыцьцяўленьня тых задач, якія ўзьнікаюць перад партыяй у зьвязку з рэканструкцыйным пэрыядам нашага сацыялістычнага будаўніцтва.** У гэтых мэтах нам нельга абыйсьціся без генэральнай чысткі сваіх радоў.

Дазвольце падаць некалькі лічбаў, што характарызуюць сацыяльны склад нашай партыі ў сучасны момаант. **На 1-га студзэня 1929 г. у партыі было ўсяго 1.530 тысяч членаў і кандыдатаў, з якіх членаў партыі 71,1 проц., кандыдатаў 28,9 проц.**

Рабочых, разам з рабочымі з Чырвонай арміі, у партыі 928.610, сялян—323.000, служачых—234.000 Процантныя суадносіны такія: звыш 60 проц. рабочы, сялян—20 проц. і каля 20 проц. служачых.

У 1921 годзе, у часе першай генэральнай чысткі, суадносіны былі іншыя. Рабочых у партыі было ўсяго 37 проц., служачых і сялян—63 проц. Сацыяльны склад партыі за гэтыя гады зьмяніўся ў бок значнага ўзмацненьня яе пралетарскага ядра. Ня гледзячы на гэта, у нашу партыю ўсё-ж пралезла значная колькасьць элемэнтаў ня толькі дробнабуржуазных, але і буржуазных, часамі-ж і контр-рэвалюцыйных. Ад такіх элемэнтаў мы павінны нашу партыю ачысьціць.

**У часе чысткі 1921 г. з партыі выбылі і было вычышчана 174.900 чал.—амаль 30 проц. яе складу.** З таго часу на 1 ліпеня 1928 г. было вычышчана яшчэ 260.144 чал. Такім чынам, пачынаючы з 1921 года з партыі была выключана вялікая армія ў 400.000 чал. Акрамя таго, за гэтыя гады праведзены былі паасобныя праверкі, і па некаторых арганізацыях процант вычышчаных членаў партыі ў сярэднім дасягаў 12.

У некаторых партарганізацыях намячаецца тэндэнцыя да складаньня чагосьці накшталт кантрольных лічбаў чысткі Адзін дакладчык у Маскве проста прапанаваў вычысьціць ня менш адной трэцяй. Такая ўстаноўка **яўна няправільная, і мы рашуча папярэджваем супроць падобных кантрольных лічбаў. З партыі трэба вычысьціць усе яе некамуністычныя элемэнты, але зусім не паводле загадзя ўстаноўленых кантрольных лічбаў.**

**КАГО ВЫЧЫСЬЦІЦЬ З ПАРТЫІ?**

Наша інструкцыя дакладна і выразна паказвае, каго трэба вычышчаць з партыі. У ёй робіцца ўпор на **[illegible] мы павінны ачысьціць яе ад усіх, [illegible] шкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву, хто падрывае аўтарытэт партыі, ад чужых элемэнтаў, ад усіх, хто сваімі паводзінамі дыскрэдытуе партыю ў вачох рабочых і сялянскіх мас. Трэба таксама ачышчаць партыю ад тых, хто заражаны бытавым загніваньнем:** ад злостных растратчыкаў, рвачоў, шкурнікаў, кар'ерыстых, ад асоб, што праяўляюць эксплёататарскія, рабаўласьніцкія адносіны да жанчын, якія ставяць асабістыя інтарэсы вышэй інтарэсаў рэвалюцыі. Такім ня можа быць месца ў радох нашай партыі. Але разам з тым, мы таксама папярэджваем, што не павінна быць дробнянага капаньня ў асабістым жыцьці і ў быце камуністых. У нашу партыю шмат рабочых прышло пасьля сьмерці Леніна, і ў іх, ды і ў нас, нямала яшчэ недахватаў ад мінулага. Трэба пры чыстцы, у першую чаргу, мець на ўвазе—ці будзе даны член партыі і ці можа ён быць карысным сацыялістычнаму будаўніцтву, ці пойдзе ён у цяжкіх умовах у бой за рэвалюцыю З гэтага пункту погляду трэба праводзіць чыстку.

Зразумела, было-б вельмі добра, калі-б члены партыі ніколі і ні пры якіх акалічнасьцях ня ўжывалі спірытусовых напіткаў, але нельга дапусьціць, каб добрага камуністага, адданага члена партыі вычысьцілі за тое, што ён дзе-небудзь крыху выпіў. У гэтых пытаньнях трэба адкінуць ханжанство, трэба дакладна рабіць розьніцу паміж таварыствам цьвярозасьці і партыяй.

Тав. Яраслаўскі агалошвае рад фактаў, якія сьведчаць аб неразумеьні часамі на мясцох задач чысткі. Сям-там створаны былі бытавыя камісіі, якія абыходзілі кватэры камуністых з мэтай высьветліць, як жывуць камуністыя. Спраўкі аб быце членаў партыі зьбіраліся ад кватарантаў, суседзяй. Такі падыход награжае тым, што чыстка будзе праходзіць пад знакам кухонных склок. Гэта недапушчальна. Мы прышлі на нарадзе з працаўнікамі кантрольных камісій да вываду, што **бытавыя камісіі трэба зараз-жа распусьціць, інакш кухонныя плёткі заслоняць ад нас клясавыя задачы чысткі.**

**НЕ ЗАСЛАНЯЦЬ КЛЯСАВЫХ ЗАДАЧ ЧЫСТКІ**

Асаблівае ўвагі патрабуе ад нас чыстка вясковых, потым савецкіх ячэек. Асабліва вялікае зрошчваньне камуністых з буржуазнымі элемэнтамі іменна на вёсцы. Але і на вёсцы чыстку трэба ставіць так, каб мы маглі пасьля чысткі стварыць там больш магутныя партыйныя ячэйкі, якія будуць карыстацца поўным давер'ем беднаты, батрацтва і серадняцкіх элемэнтаў вёскі.

**З вялікай увагай трэба аднесьціся таксама і да чысткі савецкіх ячэек, вычышчаючы адтуль «лякіраваных» камуністых, чыноўнікаў, зусім чужых нашай камуністычнай ідэалёгіі.**

Але чыстка патрэбна і ў рабочых ячэйках, дзе ў нас нямала былых людзей.

**Надзвычайна асьцярожны падыход павінен быць у нас пры чыстцы партарганізацый нацыянальных рэспублік.**

Нельга падыходзіць зараз да чысткі толькі з пункту погляду жыцьцяпісу і сацыяльнага стану членаў партыі. Возьмем, да прыкладу, Іжэўскі завод. У гады грамадзянскай вайны нямала рабочых змагалася супроць нас у радох белых, але з таго часу многія з іх перайшлі да нас і сумленна і аддана несьлі і нясуць работу ў радох партыі. Пагалоўнае вычышчэньне з партыі такіх рабочых будзе няправільнае. Трэба будзе дакладна праверыць у кожным паасобным выпадку, што прадстаўляе сабой таварыш сёньня, і толькі з такога пункту погляду вырашаць пытаньне аб ім у часе чысткі.

**Таксама трэба будзе ўлічваць своеасаблівыя ўмовы на нашых акраінах, дзе таксама асабліва важны асьцярожны падыход да членаў партыі.**

**Мы папярэджваем супроць «сьледчага» падыходу ў часе чысткі, супроць экзамэнаў.** Дапушчальна яшчэ праверка ведаў выхадцаў з іншых партый і з інтэлігенцыі, але нікуды няварта, калі мы будзем строга экзамэнаваць рабочых.

**ЧЫСТКА ПАВІННА БЫЦЬ АДКРЫТАЙ**

**Чыстка павінна быць адкрытая.** Сям-там выказваюць сумненьне, ці можна рабіць чыстку **на адкрытых сходах.**

Трэба ўлічыць, што іменна адкрытая чыстка мае для партыі вялікае значэньне. Трэба дапускаць на чыстку рабочых, батракоў, беднату, сераднякоў, не дапускаючы на падобныя сходы яўна чужых нам людзей, пазбаўленых выбарных праў і г. д. Хто будзе галасаваць на такіх адкрытых сходах? Я думаю, самае правільнае, каб галасаваньне раблася толькі праверачнымі камісіямі. Усё-ж заявы прысутных на чыстцы прымаюцца камісіямі да ведама і павінны ўлічвацца пры галасаваньні.

Трэба адзначыць, што ўжо зараз наглядаюцца непаразуменьні па пытаньнях аб адносінах да таварышоў, якія праяўляюць правы ўхіл ад генэральнай лініі партыі. Тут павінна быць ясная і выразная лінія. Калі ў наяўнасьці будзе яўнае парушэньне лініі партыі, скажэньне яе задач індустрыялізацыі, сацыялістычнага перабудаваньня індывідуальнае сялянскае гаспадаркі, калі на практычнай рабоце парушаецца генэральная лінія партыі, дык у такіх выпадках трэба такіх таварышоў з партыі выключаць. У тых-жа выпадках, калі гутарка ідзе толькі аб выказваньні поглядаў, якія адлюстроўваюць правы ўхіл, у такіх выпадках было няправільна вычышчаць таварышоў з партыі.

Вялікае значэньне для правільнага правядзеньня чысткі мае дакладны падбор камісій, уважлівае кіраўніцтва, своячасовае выпраўленьне іх памылак, шырокая інфармацыя аб іх рабоце.

**Мы павінны зьвязаць з задачай чысткі задачы прыцягненьня лепшых рабочых і батрацкіх элемэнтаў у нашу партыю. Чыстка павінна ўмацаваць нашу партыю, зрабіць яе больш моцнай.**

Па пастанове партканфэрэнцыі спрэчкі па дакладу т. Яраслаўскага не адкрываюцца.

## Супроць сухіх і шаблённых характарыстык

Полацкая арганізацыя КП(б)В скончыла асноўную работу па падрыхтоўцы да чысткі партыі. Побач з поўнымі посьпехамі ў правядзеньні гэтай работы, ёсьць і значныя недахопы. Асабліва гэта адносіцца да складаньня характарыстык.

Райкомы складалі характарыстыкі на ячэйкі сьпяшаючыся, бяз усякага сур'ёзнага падыходу. У выніку характарыстыкі не далі таго практычнага эфэкту, які яны былі павінны даць.

Неабходна адзначыць, што складзеныя характарыстыкі шаблённы і пабудаваны на агульных разважаньнях. Вось, напрыклад, характарыстыка Лісьнянскай ячэйкі КП(б)В аднаго з раёнаў Полацкай акругі.

«Ячэйка здаровая, замацавала сувязь з сялянствам. Добра пастаўлена кіраўніцтва сельсаветам. Работа ячэйкі праводзіцца плянава. Некаторыя камуністыя трымаюць у хатах рэлігійныя абразы. З гаспадарча-галіты чнымі кампаніямі ячэйка добра справілася».

Сухая агульная характарыстыка, якая ні ў якім разе не характарызуе таго, як ячэйка праводзіла сваю работу, як яна ажыцьцяўляла генэральную лінію партыі.

Ці, напрыклад, наступная характарыстыка, складзеная на Асьвейскую мястачковую парт'ячэйку. «Ячэйка ўзмацніла сувязь з мястачковай беднатой. За апошнія часы ячэйка ажывіла работу сярод сялянства ў Кісялёўскім сельсавеце. Ячэйка працуе плянава. Асноўныя палітычныя задачы прапрацоўваюцца своячасова. Па ідэалёгічным становішчы ячэйка здаровая, але сярод асобных членаў ячэйкі заўважаліся выпадкі парушэньня партдысцыпліны (адмаўленьне ісьці на работу ў сельсавет, выступленьне супроць зьніжэньня цэн у саматужных арцелях і г. д.). Ячэйка недастаткова зьвяртала ўвагу на мястачковыя саматужныя арцелі. Рост ячэйкі ішоў мэханічна. Ячэйка бліжэй падышла да кіраўніцтва жыцьцём мястэчка».

Характарыстыка гэтай «характарыстыкі» можа быць толькі адной—шмат блытаніны, агульных слоў і нічога канкрэтнага ад праробленай рабоце ячэйкі.

Можна дадаць яшчэ адзін прыклад няправільнага складаньня характарыстык. Так, у характарыстыцы, складзенай на Юзэфаўскую парт'ячэйку (Валынецкі раён), гаворыцца наступнае:

«Ячэйка складаецца з 4 членаў і 3 кандыдатаў партыі. Па сацыяльным становішчы—3 беднякі, 2 калгасьнікі, 1 серадняк і служачы. Масавая праца сярод насельніцтва носіць масавы характар. Праца па калектывізацыі праводзіцца добра». Выкананьне галоўнай задачы ў рабоце вясковай ячэйкі—работы па калектывізацыі—адэкватна ў гэтай характарыстыцы бюракратычнай адпіскай: «усё добра». Трэба адзначыць, што характарыстыкі і рэшты вясковых ячэек Полацкай арганізацыі складзены ў большасьці таксама суха і шаблённа. Райкомы КП(б)Б безадказна і казённа аднесьліся да складаньня характарыстык. Зараз Полацкі АК КП(б)Б і АКК накіравалі ў раёны лепшыя сілы для тэрміновага зьнішчэньня гэтых недахопаў у падрыхтоўчай працы да чысткі партыі.

Л. Б—скі.

## Прапіраваў клясавую лінію

### (Лагойская райпартарганізацыя, Меншчына)

**Чужы элемэнт, растратчык, падробшчык дакумэнтаў—вось якую характарыстыку можна даць кандыдату партыі Жуку, былому старшыні аднаго з сельсаветаў раёну. Калі Жук быў старшынёй сельсавету, яго ўлюбёнымі заняткамі было падчышчаць скарыстаныя маркі залу аб шлюбах і класьці грошы ў сваю кішэню.**

**Аднак, у асобе Жука захоўваўся ня толькі звычайны растратчык. Жук яўна варожы савецкай уладзе элемэнт, падкулачнік, які за бутэльку самагону гатоў прадаць інтарэсы партыі. Жук трымаў цесную сувязь з кулацтвам.**

**Дзіва, як гэта Жуку на працягу 2-х гадоў удавалася прыкрываць партыйным білетам свой сапраўдны твар.**

**Зараз Лагойскі РК КП(б)Б выключыў Жука з кандыдатаў партыі.**

С. Г.

## Будзем гатовы да генэральнай

### Партарганізацыя часьцей БВА рыхтуецца да чысткі

Чыстка і праверка партарганізацый Чырвонай арміі будзе адбывацца пры самым бліжэйшым і непасрэдным удзеле з боку грамадзянскіх парторганаў.

Ва ўсіх часьцях пытаньне аб чыстцы разглядалася на закрытых палкавых партсходах, на сходах ячэек, на адкрытых партсходах, з прыцягненьнем беспартыйных, асьвятлялася ў насьценгазэтах. Вялікае месца пытаньням чысткі ўдзяляла акруговая газэта «Чырвонаармейская Праўда».

Аднак, праверка работы, праведзеная палітклераўніцтвам і акруговай партыйнай камісіяй, а потым нарадай нач. палітаддзелаў дывізій і сакратароў партакамісій БВА выявіла, што падрыхтоўчая работа разгорнута яшчэ не даволі шырока.

Ня гледзячы на правільнае ў асноўным разуменьне задач чысткі, з боку асобных камуністых і беспартыйных ёсьць неразуменьне раду пытаньняў, зьвязаных з чысткай. Некаторыя таварышы абараняюць неабходнасьць чысткі армейскай партыйнай арганізацыі. Другія недаацэньваюць прынцыповых задач чысткі. Асобныя таварышы баяцца надыходзячай чысткі, пасьпяха адносяцца да падрыхтоўкі, імкнуцца скарыстаць у часе чысткі старыя справы, па якіх партыец падлягаў раней партыйным спагнаньням, але пасьля справіўся. Ёсьць выпадкі, калі асобныя партыйцы паслабляюць патрабаваньні да беспартыйных у адносінах іх вайсковай дысцыпліванасьці, з-за боязьні «помсты» ў часе чысткі. А некаторыя беспартыйныя робяць спробы скарыстаць чыстку для зьвядзеньня асабістых рахункаў і г. д.

Барацьба з усімі гэтымі нездаровымі зьявішчамі павінна весьціся ня гледзячы на «асобы».

Нарада начдзіваў і сакратароў партакамісій намецела рад канкрэтных практычных мерапрыемстваў, каб перамагчы гэтыя нездаровыя настрої. Будуць праведзены адкрытыя партсходы з прыцягненьнем шырокіх беспартыйных мас, таксама камсамольскія сходы, нарада ваенкораў і беспартыйнага актыву. Задачы чысткі будуць растлумачаны ў насьценгазэтах і ў мясцовым грамадзянскім друку. Побач з гэтым завострана ўвага на вывучэньні настрояў вакол чысткі і своячасовым рэагаваньні на нездаровыя настрої.

Нарада пастанавіла, каб у двухтыдневы тэрмін былі створаны дывізійныя праверачныя тройкі пад старшынствам членаў мясцовых губ. КК або АКК. Члены праверкамісій павінны быць пільна праверены праз ячэйкі, палкавыя калектывы, ДПК, падзівы, мясцовыя кантрольныя камісіі і добра праінструктаваны.

У апошні час падрыхтоўка да чысткі разгарнулася значна шырэй і лепш, чым да гэтага часу.

Некаторыя падзівы і ДПК ужо зрабілі інфармацыйныя даклады на пасяджэньнях мясцовых кантрольных камісій, на бюро губкомаў і акругкомаў аб падрыхтоўцы да чысткі. На гэтых пасяджэньнях намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па далейшай рабоце, на вывучэньні стану і работы партарганізацый, вылучаны таварышы для ўдзелу ў праверцы вайсковых камуністых.

Часу да чысткі засталося мала. Таму падрыхтоўка да яе на бліжэйшы час павінна стаць адной з цэнтральных задач усіх паліторганаў і партыйных арганізацый часьцей акругі.

Мясцовыя парторганы таксама павінны аддаць гэтай рабоце самую сур'ёзную ўвагу.

В. КУЛІКАЎ.

г. Смаленск.

## Што выявіла абсьледваньне работы Мазырскай АКК-РСІ

Камісія ЦКК УсеКП(б) правяла абсьледваньне работы Мазырскай АКК-РСІ. Абсьледваньне выявіла рад сур'ёзных недахопаў у рабоце бюро скаргаў пры АКК-РСІ. Бюро не прыцягнула да ўдзелу ў сваёй рабоце працоўных масы. Батрацтва, беднота і серадняцтва нават ня ведалі аб існаваньні бюро скаргаў. Бюро амаль што ня праводзіла сваіх пасяджэньняў па прадпрыемствах і ў рабочых клюбах. Ня дзіва, што рабочыя і работніцы зусім слабо ўдзельнічалі ў рабоце бюро скаргаў. Камісія ЦКК УсеКП(б) адзначыла, што за апошні час бюро значна палепшыла сваю работу. Бюро зрабіла некалькі дакладаў на рабочых сходах аб сваёй рабоце і пачало праводзіць свае пасяджэньні на прадпрыемствах. За апошнія тры месяцы бюро атрымала каля 400 скаргаў, на якія ў большасьці ўжо даны адказ.

Па пастановах бюро зьнята з работы некалькі хабарнікаў і бюракратаў.

Пленум АКК, заслухаўшы даклад бюро скаргаў, прыняў рад практычных мерапрыемстваў па паляпшэньні работы бюро.

Б. Ш.

ПЕРАД IX УСЕБЕЛАРУСКІМ З'ЕЗДАМ САВЕТАЎ

# САЦЫЯЛІЗМ ПЕРАМАГАЕ КАПІТАЛІЗМ

## НА УСІХ ВУЧАСТКАХ НАШАГА ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА

### (Сацыяльная праграма пэрспэктыўнага пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР)

У пэрыяд дыктатуры пралетарыяту, гэта значыць, у пераходны пэрыяд ад капіталізму да сацыялізму, на рабочай клясе і яе партыі ляжыць вялікая гістарычная задача перабудовы старога грамадзтва ў новае—сацыялістычнае.

У нашых умовах тэмп гэтай рэвалюцыйнай перабудовы старога ў новае перш за ўсё залежыць ад нераразьмеркаваньня вытворчых сіл і сродкаў вытворчасьці паміж сацыялістычнымі сэктарамі гаспадаркі, ад выцісканьня капіталістычных элемэнтаў з усіх вучасткаў нашага гаспадарчага будаўніцтва.

Пяцігадовы плян народнай гаспадаркі БССР мае тры праграмныя разрэзы: а) будаўнічая праграма, б) праграма вытворчасьці матар'яльных каштоўнасьцяй, в) сацыяльная праграма.

У той час, **як будаўнічая праграма пляну** трактуе аб пабудове і арганізацыі энэргетычнай базы і аб сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, а **праграма вытворчасьці**—аб колькасных і якасных паказальніках у вытворчасьці матар'яльных каштоўнасьцяй, **сацыяльная праграма** паказвае «хто каго» перамагае ў нашым гаспадарчым будаўніцтве—сацыялізм, ці капіталізм—хто тут наступае і хто адступае. **Сацыяльная праграма паказвае, у якой меры мы сапраўды ідзем да сацыялізму.**

Мы тут ставім сваёй задачай высьветліць—наколькі ў пэрспэктыўным пляне народнай гаспадаркі БССР запраектаваны рост і тэмп разьвіцьця сацыялістычных элемэнтаў, якія набліжаюць нас да перабудовы сацыялізму ў нашай краіне.

### I. Структура насельніцтва

Пачнем з паказальнікаў людзкога складу БССР. Спачатку толькі адзначым, што ў эпоху дыктатуры пралетарыяту перад намі стаіць вялік

# ПЕРШАЕ МАЯ Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

## У гэты дзень згуртаваныя батальёны ўзросшага пралетарыяту дэманстравалі сваю гатоўнасьць пад кіраўніцтвам кампартыі давесьці сацыялістычнае будаўніцтва да поўнай перамогі

## МЕНСК У МАЙСКІЯ ДНІ

Сьвяткаваньне 1-га мая ў Менску пачалася ў вялікае масавае народнае сьвята.

Яшчэ напярэдадні горад рыхтаваўся да пралетарскага сьвята. Будынкі, рабочыя акраіны ўпрыгожваліся зеленьню, партрэтамі правадыроў, чырвонымі сьцягамі. Увечары 30 красавіка Менск набыў сьвяточны выгляд. Сотні электрычных лямпачак залілі вуліцы рознакалёравымі агнямі.

* * *

Зранку 1 мая горад быў абуджаны гукамі шматлікіх аркестраў.

18 рабочых калён з розных раёнаў сыходзіліся на пляц Волі.

Звыш 50 тысяч чалавек зьявілася на дэманстрацыю, увесь працоўны Менск у гэты дзень запоўніў вуліцы гораду. Пралетарыят дэманстраваў свае сілы.

Грандыёзнае шэсьце. Павольна рухаюцца калёны дэманстрантаў. Над іх галавамі плывуць сьцягі, плякаты...

Лёзунгі на плякатах адбіваюць тое чым жыве сёньня менскі пралетарыят

— Абвесьцім байкот лодырам і прагульшчыкам!

— За індустрыялізацыю, за ўздым і калектывізацыю сельскае гаспадаркі!

— Шырэй разгорнем сацыялістычнае наступленьне ў горадзе і вёсцы!

— У дзень 1 мая шчыльней згуртуем працоўных вакол ленінскай бальшавіцкай партыі

— СССР адзінная краіна, дзе рабочыя свабодна дэманструюць свае клясавае адзінства і міжнародную салідарнасьць!

— Прэч папоў рабінаў і ксяндоў!

... Альлё... Альлё... гаворыць Масква, Ленінград, Харкаў, Арцёмаўск, Чырвонае Сормава.

Яны перадаюць першамайскае прывітаньне працоўным савецкай Беларусі...

... 12 гадз. 35 хв. На трыбуне пляцу Волі зьяўляюцца т. т. Гамарнік, Чарвякоў, Гладзед, Ягораў, Хацкевіч, Рыкоў, Піяцер і іншыя члены ўраду і ЦК КП(б)Б.

... Альлё... Альлё... гаворыць Менск... Ад імя працоўных савецкай Беларусі перадаю прывітаньне пралетарам Масквы, Ленінграду, Баку і інш. пралетарскіх асяродкаў—водгульлем ня суцца па ўсёй плошчы словы ўсебеларускага старасты тав. **Чарвякова.**

— Мы ў Беларусі сьвяткуем 1 мая на рубяжы 2-х сьветаў, на мяжы з капіталістычным сьветам.

— Пралетары Менску і ўсёй савецкай Беларусі.—кажа далей тав Чарвякоў,—асабліва моцна адчуваюць і разумеюць значэньне першамайскага сьвята.

— Савецкая Беларусь нарадзілася ў агні грамадзянскай вайны... Зараз працоўныя нашай рэспублікі вядуць работу па сацыялістычным разьвіцьці сваёй гаспадаркі і культуры.

— Але калі мы ў дзень першага мая маем магчымасьць падводзіць вынікі праробленай працы, то ў гэты самы час нашы браты ў капіталістычных краінах мучацца пад уціскам капіталу.

— Нашы перамогі будуць парукай таго, што пераможа пралетарыят усяго сьвету.

— Брагэрскае пралетарскае прывітаньне ад савецкай Беларусі пралетарам СССР і ўсяго сьвету,—заканчвае **тав. Чарвякоў.**

Адзін за другім выступаюць усё новыя прамоўцы.

На трыбуне рабочы чыгуначнік Менскага вузла тав. Шнэгель.

— XVI партканфэрэнцыя прыняла пяцігадовы плян народнай гаспадаркі,—гаворыць тав. Шнэгель.—Чыгуначнікі Менскага вузла абяцаюць, што яны ня толькі выканаюць гэты плян, але і перавысяць яго.

* * *

На вялікай плошчы Парыскай Камуны парад і агляд часьцям Менскага гарнізону. Але для чырвонаармейцаў сёньня асабліва ўрачысты дзень. Маладыя байцы даюць чырвоную прысягу.

Т. т. Чарвякоў, Галадзед, Хацкевіч, Карклін, Славінскі на перасоўных трыбунах-аўтамабілях прымаюць чырвоную прысягу.

... Я сын працоўнага народу, грамадзянін СССР прымаю на сябе імя байца рабоча-сялянскай Чырвонай арміі... Я абавязуюся насіць гэтае імя з гонарам,—паўтараюць чырвоныя байцы.

Прысяга прынята. Ад імя ўраду і партыі чырвоным байцом перадаюць прывітаньне.

Парад скончыўся, пэрамоніяльным маршам вайсковыя часьці накіроўваюцца на пляц Волі.

Часьці Менскага гарнізону паказалі ў гэты дзень добрую вытрыманасьць.

**М. К.**

## Радыё на аўтамабілі

— «Алё, гаворыць Масква, Менск, Баку...

Усе ўзьнімаюць галавы ўверх, але там нічога няма. Глянуўшы ў бок, бачыш аўтамабіль, адкуль чуюцца прывітаньні і музыка. Гэта Менскае таварыства прыхільнікаў радыё наладзіла радыё-перасоўку-аўтамабіль.

Ён упрыгожаны зеленьню, лёзунгамі, плякатамі. Нашы радыё-аматары настойліва патрабуюць пашырэньня радыё ў вясковую глушь, заклікаюць не даваць ніводнай капейкі папом, рабінам і ксяндзом.

На чырвоным стале, што пастаўлены на аўтамабілі, блішчаць лямпы, антэна, рамка і цэлая сетка праводоў. Вялікія гучнагаварыцелі, накіраваныя наперад, у зад і ў бакі льлюць словы, прывітаньні і гукі парадаў на плошчах сталіц і галоўных рабочых цэнтраў СССР.

У часе дэманстрацыі радыё-перасоўка павольна аб'яжджала калёны дэманстрантаў, якія далёка і шырока раскінуліся ад пляцу Волі. Заднія калёны мелі поўную магчымасьць слухаць усё, што гаворылася ня толькі ў нас на пляцы Волі, але і ў Маскве, Харкаве і іншых гарадох. Усюды, дзе аўтамабіль спыняўся, зараз-жа зьбіраўся навакол яго вялікі натоўп народу, які ўважліва сачыў за перадачай.

Маленькі перапынак. Пасыпаліся запытаньні аб тым, як гэта можна слухаць з аўтамабіля, прыймаць на такую маленькую антэну і г. д.

І працаўнікі радыё-аўтамабіля давалі поўныя зразумелыя адказы.

Як толькі разыйшліся дэманстранты па дамох, радыё-аўтамабіль накіраваўся ў рабочыя і прыгарадныя раёны.

**Дзем—і.**

Часьці Менскага гарнізону на дэманстрацыі



Першамайская дэманстрацыя на вуліцах Менску

## 1-га мая ў рабочых клюбах Менску

**Першамайскія сьвяты ў клюбе гарбароў пачаліся 30-га красавіка ўрачыстым вечарам для рабочых працалектываў абутнікаў і рымароў.**

**Мастацкія гурткі клюбу добра падрыхтаваліся да абслугоўваньня рабочай масы гарбароў у дні сьвята. Пасьля дакладу аб 1-м маі і аб ролі вялікадню, як сродку адурманьваньня працоўных, адбыліся мастацкія пастаноўкі на антырэлігійныя тэмы.**

**Вечарам 1-га мая ў клюбе адбыўся ўрачысты сход рабочых шчотачнай фабрыкі, 2-га мая вечар рабочых гарбарні «Бальшавік».**

**У дакладзе аб 1-м маі было зазначана, як найлепш правесьці сацыялістычныя спаборніцтвы паміж гарбарнямі і абуткавымі фабрыкамі.**

**— Мы дакажам капіталістычным краінам, што рабочыя СССР вольна будуюць сваю гаспадарку, цалкам адданы справе будаўніцтву сацыялізму.**

**— Наша сьвята—сьвята перамогі на гаспадарчым фронце, на фронце дустрыялізацыі,—пад такім лёзунгам правяла гарбарня «Бальшавік» вечар, прысьвечаны першамайскім сьвятам.**

**Гэтыя лёзунгі ажыцьцяўляюцца сёньня на ўсебеларускай канфэрэнцыі прадстаўнікоў прадпрыемстваў Белскур трэсту, дзе падпісваецца дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва паміж гарбарнямі і фабрыкамі абутку БССР.**

**Сёньня ў клюбе адбудзецца антырэлігійны вечар для членаў саюзу гарбароў. Пасьля вечару гарбары выйдуць на вуліцу і прымуць удзел у антывялікодным карнавале.**

* * *

Клюб камунальнікаў знаходзіцца на Нямізе. І каб ня сьвята 1-га мая—яго нельга нават, адрозьніць як культурную ўстанову, ад прыватных будынкаў.

У дзень вялікага пралетарскага сьвята, клюб набыў сьвяточны выгляд і прыцягвае да сябе дзесяткі соцен працоўных.

Вечарам, напярэдадні 1-га мая, камунальнікі слухалі даклад, глядзелі пастаноўку «Майскі жук» і балет. Усё гэта было выканана сіламі клюбу.

У агульным карнавале на дэманстрацыі прынялі актыўны ўдзел члены ячэйкі «Бязбожнік».

— Што мне бог.—казала старая жанчына на вечары ў клюбе,—калі сама я не заработаю, то і бог ня дасьць. Я служыла хатняй работніцай ў чатырох папоў і аднаго дзяка і бачыла, што яны ядуць блінцы з салам, а я і капусьце была рада. А зараз я атрымліваю трыццаць рублёў і адчуваю сябе роўнай з усімі.

— Мы парываем сувязь з рэлігійным дурманам,—заявілі камунальнікі. Наша задача—імкнуцца да сацыялізму, зьнішчаючы ўсе перашкоды на шляху.

Вечарам 1-га мая, невялікія тры пакойчыкі клюбу былі перапоўнены.

2-га мая клюб правёў дзіцячы раніпнік. Для дзяцей быў наладжаны канцэрт з гасьцінцамі. А вечарам пастаноўка «Ганька» для хатніх работніц групкому № 1.

Не забыліся камунальнікі і пра сваіх падшэфных. Запрасілі да сябе ў госьці сялян і чырвонаармейцаў. А ад сябе ў падшэфны сельсавет паслалі кіно-перасоўку. Пажарнікі выяжджалі ў Прылукі, дзе наладзілі спэктакль. У вёску была паслана брыгада цырульнікаў для абслугоўваньня сялян.

Ветліва сустрэлі чырвонаармейцы камунальнікаў, госьці разам з чырвонаармейцамі прымалі ўдзел ва ўрачыстым пасяджэньні, быў наладжаны лятучы цір.

Сваю работу клюб цесна ўвязаў з надыходзячым вялікаднем. Напярэдадні вялікадня клюб наладжвае «кубак гарбаты». Адбудзецца таксама антырэлігійная пастаноўка «Воскресенье». У вёску пасылаецца кіно-перасоўка.

**УЛ. Б—вік.**

* * *

Зеляніна і лёзунгі ўпрыгожылі залю друкароў. Адчуваецца сьвята....

Ужо напярэдадні першага мая клюб напоўніўся друкарамі. У сьвяточным убраньні сабраліся рабочыя спаткаць дзень 1-га мая. Уважліва слухаюць даклад і канцэрт.

Пасьля дэманстрацыі, вечарам, ажыў клюб. У невялічкім пакоі за сталом засела моладзь, а ў руках у іх хутка з паперы скручваліся трубачкі—лётарэйныя білеты. Гэта ячэйка МОПР'у арганізавала лётарэю. А ў залі клюбу ішла пастаноўка «Гоп-ля, мы жывем», сьветлавая газэта.

На працягу першых дзён мая, пры клюбе ўвесь час працаваў дзіцячы пакой, а для большых дзяцей быў наладжаны раніпнік.

У сувязі з вялікаднем, 4-га мая клюб наладжвае карнавал, дае канцэрт са скокамі.

**УЛ.**

* * *

**Пасажырскі вакзал і клюб імя Леніна ўпрыгожаны першамайскімі лёзунгамі. Чыгуначнікі сабраліся ў клюб паслухаць даклад аб 1-м маі, паглядзець выступленьне сіняй блюзы, паслухаць канцэрт. Цэлы дзень клюб адкрыты. За шашачнымі сталамі паўнютка людзей. Бібліятэка таксама разгарнула шырокую працу. Наладзіла выстаўку першамайскай і антырэлігійнай літаратуры, згрупаваўшы вакол сябе чытачоў. В.Б.**

* * *

Рабочыя менскага халадзільніку наладзілі вечар сумесна з рабочымі броварў і падшэфнай вайсковай часьцю. Усяго на вечары было 700 чалавек у тым ліку 15 сялян з падшэфнай вёскі. Пры клюбе для дзяцей быў арганізаваны спэцыяльны пакой.

Сялянін ад падшэфнае вёскі, тав. Красьнішчын, ад імя сялян заявіў, што асноўная маса сялянства, беднота і сераднякі, заўсёды разам з рабочаю клясаю будуць прымаць удзел у сацыялістычным будаўніцтве.

Рабочыя прынялі вызаў Магілеўскага хлебазаводу і пастанавілі ўступіць у сацыялістычныя спаборніцтвы. Яны абяцаюць у працягу мая месяца ўзьняць вытворчасьць на сваім заводзе яшчэ на 10 процантаў і давесьці брак да мінімуму.

**Кінох.**

* * *

1-га мая ў клюбе школы АДПУ адбыўся вечар спайкі паміж рабочымі гуты «Пралетары» і курсантамі школы. Мастацкія гурткі абодвых калектываў падрыхтавалі вялікую цікавую праграму. Сьвята абярнулася ў вечар самадзейнасьці. Асабліва ўдала было выступленьне спартыўных гурткоў.

Старыя рабочыя і работніцы выступалі з успамінамі аб тым, як праводзіўся дзень 1-га мая да рэвалюцыі.

Адначасова ў казармах адбываўся ўрачысты вечар спайкі паміж войскам АДПУ і рабочымі хэмфармзаводу, працалектыву «Чырвоны Хэмік», і супрацоўнікамі Белшялотрэсту.

На вечары прысутнічала звыш 400 чал.

Пасьля невялікага дакладу аб 1-м маі мастацкія гурткі наладзілі вялікі канцэрт.

* * *

Яшчэ з 22-га красавіка ў клюбе харчавікоў пачалася сэрыя антырэлігійных вечароў для рабочых харчавых заводаў і фабрык.

24-га красавіка ў зьвязку з першым днём яўрэйскага вялікадня ў клюбе адбыўся вялікі антырэлігійны вечар для рабочых-яўрэяў. Нельга не адзначыць, што ў гэтым годзе лік наведвальнікаў клюбу ў шмат разоў большы, чым ў мінулым годзе. Рабочыя, што летась яшчэ не адважваліся адмовіцца ад мацы і «сэйдэру», у гэты вялікдзень прышлі ў клюб і прынялі актыўны ўдзел у антырэлігійных вечарох.

Дні сьвята—1, 2, 3 мая прайшлі надзвычайна ажыўлена. Драмгурткі клюбу кожны вечар давалі пастаноўкі на антырэлігійныя тэмы. Рэдкалегіі прадпрыемстваў, апрача насьценгазэт, выпускалі таксама і сьветлавыя газэты.

30 красавіка адбыўся вечар рабочых заводу «Чырвоная Зара». 1-га мая клюб абслужыў рабочых працалектыву пекароў, 2-га—вечар рабочых бойні, 3-га—антырэлігійны вечар для членаў саюзу.

— Ніводнага рабочага ў царкве ў дзень вялікадня—такі лёзунг выкінулі харчавікі.

## У Віцебску

**ВІЦЕБСК, 2. Першамайскія сьвяты ў Віцебску прайшлі пад знакам шырокага ўдзелу працоўных у сацыялістычным спаборніцтве. На вечарох, што адбыліся ва ўсіх клюбах, і на ўрачыстых пасяджэньнях падагульваюцца вытворчыя посьпехі прадпрыемстваў. Панчошная фабрыка адсьвяткавала 10-гадовы юбілей свайго існаваньня. З невялікай майстэрні з 30 работніцамі яна ператварылася зараз у мэханізаваную, абсталяваную паводле апошняга слова тэхнікі фабрыку, якая налічвае каля 1.000 рабочых і работніц. Заводу «Чырвоны Мэталісты», які выклікаў усе прадпрыемствы Віцебшчыны на спаборніцтвы, сутаварыская №-ая авіяэскадрылья паднесла ўчора ў Белдзяржтэатры чырвоны сьцяг.**

**Гута «Ноўка» абвясьціла конкурс на лепшага шліфоўшчыка. Фабрыка акуляраў пашыраецца і адкрывае сёньня новы цэх.**

**У вялікіх першамайскіх дэманстрацыях прыняло ўдзел шмат прыбыўшых з вёсак сялян.**

## У Магілеве

### Прыезд 650 ленінградзкіх рабочых

**МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). 1 мая ў Магілеве спынілася дэлегацыя ленінградзкіх рабочых у ліку 650 чалавек, якая накіроўваецца ў Кіеў і Днепрастрой. Ленінградзкія рабочыя едуць у спэцыяльным цягніку, у ім абсталяваны клюб і кіно, у кожным вагоне ёсьць радыё, а таксама свая перадатачная станцыя. На вакзале ленінградцаў сустракала спэцыяльная дэлегацыя ад прафсаюзаў і Чырвонай арміі. Пасьля 15-хвіліннага мітынгу ленінградцы накіраваліся ў Магілеў, дзе іх сустрэла 10-тысячная дэманстрацыя магілеўскага пралетарыяту.**

**Мэта заезду ленінградзкіх рабочых ў Магілеў—жаданьне азнаёміцца з жыцьцём Беларусі і ў прыватнасьці з Магілевам—месцам былое царонае отаўкі ў імпэрыялістычную вайну.**

## У Бабруйску

**БАБРУЙСК. (Наш кар.). Увечары 30 красавіка па ўсіх клюбах адбыліся ўрачыстыя сходы рабочых. Агульны сход працаўнікоў асьветы пастанавіў падпісаць з гаркомам КП(б)Б і гарсаветам дагавор аб уступленьні ў сацыялістычныя спаборніцтвы. У парадку грамадзкай нагрузкі настаўнікі навучаць грамаце 200 непісьменных. На сацыялістычныя спаборніцтвы бабруйскія асьветнікі выклікаюць Магілеў, Менск, Гомель і раёныя цэнтры Бабруйшчыны. Дэлегацыі ад рабочых выяжджалі ў падшэфныя вёскі.**

**У першамайскім парадзе ўдзельнічала звыш 10 тысяч працоўных Бабруйску. Бабруйск адзначыў першамайскае сьвята адчыненьнем дзіцячага пакоя, пры радзільным аддзяленьні савецкае аптэкі на 40 ложкаў, Пашырана капэрацыйная сетка на 7 крам. Ва ўсіх гарадох і большасьці вёсак округі адбыліся першамайскія дэманстрацыі працоўных.**

## За дружнае супрацоўніцтва дзяцей усіх нацыянальнасьцяй
## Супроць антысэмітызму

**(На «зьлёце» піянэраў у Белдзяржтэатры).**

30-га красавіка Беларускі дзяржаўны тэатр абярнуўся ў вялікі піянэрскі клюб. Тут былі і дэлегаты піянэраў і школьнікаў усяго Савецкага Саюзу.

Яны прыехалі ў Савецкую Беларусь для азнаямленьня з бытам і жыцьцём працоўных яўрэйскіх земляробчых калёній. Яны пажадалі сваімі вачыма ўбачыць, як разьвіваецца сельская гаспадарка ў яўрэйскіх калёніях, як жывуць дзеці яўрэяў-сялян, каб выкрыць хлусьню, якую распаўсюджваюць антысэміты аб працоўным яўрэйскім сялянстве.

Піянэры і школьнікі Беларусі з вялікай радасьцю спаткалі сваіх гасьцей-дэлегатаў.

— Змагайцеся з антысэмітызмам!

— За пралетарскую таварыскасьць паміж дзяцьмі ўсіх нацыянальнасьцяй —гучэлі словы піянэраў.

* * *

Тав. **Гайдуковіч** адкрыў урачысты сход ад імя ЦБ юных піянэраў. Салютам, барабанным боем спаткалі піянэры прывітаньні прадстаўнікоў старэйшых пакаленьняў камуністычнай партыі і камсамолу.

Ад імя ЦК КП(б)Б піянэраў вітаў т. **Стасевіч**, ад імя ЦК ЛКСМБ—т. **Галавач**, ад Наркамасьветы—т. **Баліцкі**, ад Азэту—т. **Каменштэйн.**

На сёньнешні дзень мы маем у Беларусі каля 200 яўрэйскіх калёній. Піянэры-дэлегаты могуць азнаёміцца ў сапраўднасьці з посьпехамі піянэр-арганізацыі БССР на фронце барацьбы з нацыянальнай варожасьцю,—вось сэнс выступленьняў прамоўцаў.

— Гарачае прывітаньне піянэрам усяго Савецкага Саюзу—пясецца на залі.

— Ура нашай зьмене!

Ад імя дэлегатаў на прывітаньні адказаў піянэр з Украіны т. **Рудненка.** Ён гаворыць на украінскай мове. Уважліва слухае піянэрыя свайго таварыша з Украіны.

— Будзем узмацняць пашае сяброўства, будзем дзяліцца практыкай. Адна з галоўнейшых нашых задач—барацьба з антысэмітызмам, са зброяй клясавага ворагу. Мы за цеснае супрацоўніцтва дзяцей усіх нацыянальнасьцяй.

— Піянэры, да барацьбы з антысэмітызмам, будзьце гатовы!—канчае сваю прамову **Рудненка.**

Урачыстым абяцаньнем, піянэрскай прысягай гучыць адказ усёй залі:

—Заўсёды гатовы!

* * *

Сход абраў дэлегацыю з 5 піянэраў для суправаджэньня гасьцей у яўрэйскія калгасы і калёніі.

**С. Г—н.**

Усесаюзная дэлегацыя піянэраў у Менску

## Сацыялістычнае спаборніцтва

### ДАГАВОР паміж „ЭНЭРГІЯЙ" І „КАМУНАРАМ" [1]

### „Энэргія" абавязваецца зьнізіць сабекошт на 8,4 проц., „Камунар" на 8 проц.

Ад імя рабочых, служачых і інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў машынна-будаўнічага заводу «Энэргія» ў колькасьці 546 чал. і машына-будаўнічага заводу «Камунар» у колькасьці 560 чал., мы, ніжэйпадпісаныя прадстаўнікі рабочых паказаных заводаў, сьледуючы паказам нашага настаўніка Ільліча, абвяшчаем сацыялістычнае спаборніцтва паміж вышэйказанымі заводамі да канца 1928-29 апэрацыйнага году па найбольш пасьпяховым выкананьні заданьня партыі і ўраду, аньніжэньня сабекошту па «Энэргіі» на 8,4 проц. і па «Камунары» на 8 проц.

Мы заключаем гаспадарча-палітычны дагавор і даем абяцаньне выканаць поўнасьцю праграмнае заданьне па прамфінплянах нашых прадпрыемстваў.

Для больш пасьпяховага правядзеньня спаборніцтва і выкананьня гаспадарчага палітычнага дагавору, **абавязваемся:**

1) У самы кароткі тэрмін дабіцца ўстапаўленьня цьвёрдай сацыялістычнай працоўнай дысцыпліны па нашых прадпрыемствах. Мы абавязваемся праводзіць самую рашучую і жорсткую барацьбу в парушэльнікамі працоўнай дысцыпліны, прагуламі, расхлябанасьцю ў рабоце, нядбайным абыходжаньнем з сырцом, матар'яламі і абсталяваньнем.

2) Зьнізіць да мінімуму глум, палепшыць якасьць выпускаемае прадукцыі.

3) Узьняць прадукцыйнасьць варштатаў, вымешчыўшы да мінімуму прастоі іх.

4) Уцягнуць рабочых ІТС, служачых і адміністрацыю ў работу вытворчых нарад.

5) Праводзіць у жыцьцё эканамічна-карысныя прапановы рабочых, унесеныя на вытворчых нарадах.

6) Устанавіць абмен дасягненьнямі ў галіне ўдасканаленьняў і вынаходніцтваў. Сыстэматычна асьвятляць у друку і ў насьценгазэтах вынікі выкананьня дагавору.

Пацьвярджаючы свае абавязацельствы выконваць усе паказаныя ў гэтым дагаворы пункты, **даем сваё пралетарскае абяцаньне бязумоўна выконваць усе мерапрыемствы, накіраваныя да ажыцьцяўленьня пастаўленых партыяй і ўрадам задач.**

**Мы заклікаем усе прадпрыемствы пасьледваць нашаму прыкладу.**

**НАПЕРАД ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ! ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ! ЗА ЗЬНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ!..**

Дагавор 29-га красавіка зацьверджан актывам абодвух заводаў у ліку 75 чалавек.

Падпісан будзе дагавор 12-га мая.

1) Дагавор друкуем у значна скарочаным выглядзе.

## СЬВЯТА ГАРБАРОЎ

### Сёньня гарбары і абутнікі заключаюць дагавор

**(ГУТАРКА З СТАРШЫНЁЙ ЦП САЮЗУ ГАРБАРОЎ т. РУМАНОВЫМ)**

Усебеларуская канфэрэнцыя гарбароў прадпрыемстваў Белскуртрэсту, якая сёньня адкрываецца, паложыць пачатак сацыялістычнаму спаборніцтву паміж усімі гарбарнямі і фабрыкамі абутку БССР.

Рабочыя-гарбары горача адгукнуліся на заклік VIII усебеларускага зьезду наладзіць сакоду аб арганізацыі спаборніцтва па ўзьнаўленьні прадукцыйнасьці працы, прадцысцыпліны і зьніжэньні сабекошту прадукцыі.

На ўсіх прадпрыемствах працуюць **штабы спаборніцтва.** Некаторыя гарбарні («Бальшавік», імя Лекерта) і фабрыкі абутку (Менская і Гомельская) дабіліся ўжо рэальных вынікаў у галіне ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы і працоўнай дысцыпліны.

Дагавор, які будзе сёньня падпісаны на канфэрэнцыі, намячае канкрэтныя заданьні для кожнага прадпрыемства паасобку. Падпісаньне дагавору па сацыялістычным спаборніцтве прыстасоўваецца да адкрыцьця жэлятыннага і клаечнага цэхаў на гарбарні «Бальшавік». У рабоце канфэрэнцыі, акрамя дэлегатаў, прымуць удзел і рабочыя гарбарні «Бальшавік» і Менскай фабрыкі абутку. На адкрыцьцё новых цэхаў і для ўдзелу ў рабоце канфэрэнцыі запрошаны прадстаўнікі партыі ураду і прафсаюзу.

**Г.**

## Бліжэй да працоўных

**(Да III усебеларускага зьезду вучастковых дактароў)**

Сёньня адкрываецца III усебеларускі зьезд вучастковых дактароў.

Асноўная задача зьезду—абгаварыць 5-цігадовы плян будаўніцтва аховы здароўя ў БССР, унесьці ў яго патрэбныя карэктывы.

Трэба адкрыта сказаць, што мы ўступаем у найбольш цяжкі зьрыяд будаўніцтва аховы здароўя ў Савецкай Беларусі. Зусім правільна правадзімая партыяй і савецкай уладай палітыка індустрыялізацыі краіны і поўнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, патрабуе ад рэспублікі наймацнейшага напружаньня ўсёй эканомікі. Ужо цяпер пачынае назірацца тэндэнцыя да зьніжэньня ўдзельнай вагі аховы здароўя ў мясцовым бюджэце. К канцу пяцігодкі ўдзельная вага аховы здароўя не падымецца, а нават некалькі ўпадзе ў адносінах да ўсяго бюджэту рэспублікі. Адсутнасьць гатовага будаўнічага фонду для новага мэдыка-санітарнага будаўніцтва зьявіцца значнай перашкодай для разгортваньня новай сеткі. Слабая падрытоўка спэцыялістых ня дасьць на бліжэйшыя гады магчымасьці кваліфікаваць мэдыцынскую дапамогу. Сыстэма мэдыка-санітарнага абслугоўваньня патрабуе значных зьмен. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі прымусіць цэнтр увагі доктара на вёсцы перанесьці на калгасы, камуны, саўгасы; прамысловасьць з кожным годам будзе высоўваць праблему поўнай дыспансэрызацыі лячэбнай і амбуляторнай дапамогі.

Рацыяналізацыя мэдыка-санітарнай справы ў горадзе і прыстасаваньне апошняе для патрэб працоўнага насьніцтва цалкам упіраецца ў пастаноўку мэдыцыны на вёсцы. Адным з мэтадаў рацыяналізацыі зьявіцца ў першую чаргу памяншэньне радыусу абслугоўваньня сялянства, набліжэньня апошняга да доктара. Асноўным тыпам мэдыцынскай установы на вёсцы павінна зьявіцца сельская доктарская амбуляторыя з дыспансэрным распаядкам сваёй працы. Па пляне мы намячаем пабудаваць 74 доктарскія амбуляторыі замест гэткай-жа колькасьці фэльчарскіх пунктаў, у першую чаргу пры калгасах або саўгасах. Стацыянарам гэткага сельскага дыспансэру будзе раённая больніца на 40 ложкаў. Мы дапушчаем па пяцігодцы пабудаваць 30 новых будынкаў для больніц. Да канца пяцігодкі колькасьць фэльчарскіх пунктаў будзе зьніжана процантаў на 60 і мэдпэрсанал атрымае нясумненна больш лепшыя ўмовы для сваёй працы.

Дапаможным зьвяном да сельскага доктарскага дыспансэру павінен быць акушэрска-фэльчарскі пункт, задача якога, галоўным чынам, аказваць акушэрскую дапамогу і служыць правадыром ідэй аховы мацярыі і дзіцяці сярод мясцовага насельніцтва. Усе гэтыя пункты павінны працаваць пад кіраўніцтвам доктара, які загадвае сельскім доктарскім дыспансэрам.

Адным з галоўнейшых зьвеньняў на раёне павінна зьяўляцца санітарная арганізацыя. Пярэвшая задача доктара—быць адным з арганізатараў новага быту ў вёсцы. Для яго зьяўляецца абавязковым удзел у разглядзе ўсіх тых пляноў, якія распрацоўваюцца ў раёне ў сувязі з новым будаўніцтвам калгасаў і саўгасаў. Пад кіраўніцтвам санітарнага доктара павінны праводзіцца і шырокія супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы.

Баявым лёзунгам павінна стаць—грамадзкая лазьня з дэзкамэрай на раёне, грамадзкая лазьня ў калгасах, павялічэньне працускной здольнасьці лазьняў у акруговых гарадох, усямерная агітацыя і дапамога сялянству ў арганізацыі лазьняў на вёсцы.

Правадырамі санітарнай культуры ў вёсцы над кіраўніцтвам санітарнага доктара павінны быць санітарныя камісіі вясковых саветаў, санітарна-вэтэрынарныя апякуны і санітарныя ўпаўнаважныя ў саўгасах і калгасах. Таксама вялікую дапамогу санітарнаму доктару могуць даць ячэйкі Чырвонага Крыжу ў вёсцы, гурткі першай дапамогі і санітарныя дружыны.

Без актыву сялянскай грамадзкасьці цяжка будзе ажыцьцявіць усе тыя вялікія задачы па аздараўленьні вёскі, якія ставіць перад сабой Наркамаховы здароўя. Таму з асаблівай настойлівасьцю трэба дабівацца арганізацыі саветаў сацыяльнай дапамогі пры ўсіх лячэбна-прафілактычных установах на раёне. Гэткі савет, складзены з беднякоў і сераднякоў і актывістак-сялянак дасьць магчымасьць доктару найлепшым чынам скарыстаць энэргію сялян у справе паляпшэньня мэдыка-санітарнай дапамогі. Асаблівы інтарэс набывае правядзімая ў сучасны момант кампанія па страхоўцы сялянак на выпадак мацярынства. Уся гэта кампанія праводзіцца праз камітэты сялянскай узаемадапамогі. Неабходна ўсім дактаром раёну і ў першую чаргу доктару дзіцячай кансультацыі зьвязацца з камітэтам сялянскай узаемадапамогі і ўзяць на сябе мэдыцынскае кіраўніцтва гэтай справай.

Асноўнай задачай у горадзе на бліжэйшыя пяць год павінна быць канчатковае афармленьне дыспансэрнай дапамогі ва ўсіх амбуляторыях і больніцах. Тут асабліва трэба зьвярнуць увагу на амбуляторную дапамогу, якая знаходзіцца непасрэдна на прадпрыемствах. На кожным заводзкім прадпрыемстве, на якім ёсьць ня менш 100 рабочых, трэба арганізаваць пункт першай мэдыцынскай дапамогі. Гэта будзе першае зьвяно і найважнейшае ў гарадзкой мэдыцыне Мэдыцынскі пункт павінен быць зьвязаны з санітарнай арганізацыяй Задача доктара—дабівацца пры будаўніцтве новых заводаў абавязковай пабудовы заводакіраўніцтвамі памяшканьняў для амбуляторных пунктаў, ясьляй, кансультацый і кватэр для мэдпэрсаналу. Доктар, працуючы на заводзе, павінен скарыстоўваць і рабочы актыў для прафілактычных мэт. Такім актывам зьяўляюцца камісіі па ахове працы і вытворчыя нарады.

Адным з галоўнейшых зьвеньняў лячэбна-прафілактычнай справы ў горадзе павінен быць дыспансэр. Калі тубэркулёзныя дыспансэры за апошнія два гады разгарнулі шырокую прафілактычную дзейнасьць па аздараўленьні працы і быту рабочых, дык гэтая нельга сказаць пра дыспансэры вэнэралёгічныя, праца якіх да гэтага часу яшчэ ня носіць зусім прафілактычны характар. Асноўная задача, якая стаіць перад усімі дыспансэрамі,—гэта найбольшая ўвязка сваёй працы з дактарамі дапамогі на даму, з саветамі сацыяльнай дапамогі, з сэкцыямі аховы здароўя і з камісіямі аховы працы на заводах.

Для вэндыспансэраў на бліжэйшы час стаіць праблема ператварэньня іх у сучасную прафілактычную установу, мэтадам працы якіх павінна быць ня толькі індывідуальнае лячэньне хворых, але і аздараўленьне бытавых умоў.

Барацьба з сацыяльнымі хваробамі ў БССР павінна ісьці па чатырох галоўнейшых інфэкцыях: тубэркулёзу, сыфілісу, трахоме і грыбковых захворваньнях валасоў (парша). Асноўнае значэньне набывае правільна арганізаваная мэдыцынская дапамога на раёне, бо сельская доктарская амбуляторыя павінна быць пастаўлена так, каб хоць тры інфэкцыі—тубэркулёз, трахома і сыфіліс—былі-б узяты пад дакладны нагляд і лячэньне. Неабходна дадаць, каб к канцу пяцігодкі была-б канчаткова ліквідавана ганебная спадчына мінулага—бытавы сыфіліс на вёсцы.

**БАРСУКОЎ.**

## Справа аб прасьледваньні селькора Курганава

**(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)**

Скончыўся допыт сьведак. Больш 15 чалавек прайшло перад судом. Суд і бакі доўга трымалі кожнага сьведку, імкнучыся выявіць поўную карціну злачынства.

Сьведка **«Курганаў** зьяўляецца бацькам і ўдзельнікам забойства дзіцяці». Ці можна было верыць словам «ледзі Макбэт Расьнянскага раёну», якая, як выяўлена, не ўпяршыню практыкуе мэтад забойства дзяцей? Не, нельга! **«Алібі» Курганава** зусім яснае. Забойства зроблена ў лесе, за 10 вёрст ад Расны, у будні дзень, задоўга да заходу сонца (гэта выяўлена з допыту Гарлюскінай). Як мог у гэтай справе удзельнічаць **Курганаў,** які да позьняга вечару сядзеў у сваёй краме, як не заўважыла гэтага моманту Расьнянская міліцыя, якая дапытвала **Тармоскіну.**

Сьведка **Ігнаценка**—сакратар Даўгавіцкай ячэйкі,—адзін з нягласных прасьледвацеляў Курганава, які цкаваў яго ўжо пасьля ад'езду падсудных з Расны, імкнецца ачарніць Курганава ў вачох суду. Па яго словах, Курганаў, калі працаваў у сельсавеце, растраціў каля 60 руб. грамадзкіх грошай і яго за гэта зьнялі з работы.

— Добра,—пытаецца суд,—а чаму пасьля гэтага **Курганава** абралі сакратаром раённай рэвізійнай камісіі, магчыма, растратчык з сельсавету лягчэй вылавіць растратчыкаў з усяго раёну?

**Ігнаценка** не знаходзіць адказу.

Іншыя сьведкі выяўляюць рад новых момантаў з жыцьця і работы расьнянскай верхавіны. Былы старшыня РВК **Гайдараў** на працягу 2-х год трымаў у кішэні каля 2.060 руб. страхоўкі за згарэўшы млын. Пасьля ад'езду за ім яшчэ засталася запазычанасьць у суме каля 200 руб.

На службу ў мясцовыя ўстановы прымалі былых растратчыкаў і цёмны элемэнт. Нарсуд

# Вывучэньне грамадзкай вайны ў Беларусі

## (Да ўдзельнікаў)

Гісторыя і падлік дасьведчаньня грамадзянскай вайны ў Беларусі мае вялізнае значэньне. Савецкая Беларусь умацавалася і акрыяла ў рэзультаце доўгіх і ўпартых клясавых боек пралетарыяту і працоўнага сялянства ня толькі супроць сваіх уласных памешчыкаў і буржуазіі. Нямецкая і бела-польская акупацыя налажыла пячатку на разьвіцьцё клясавых боек працоўных Беларусі.

У змаганьні за зьвяржэньне акупантаў, таксама як і ў змаганьні за ўмацаваньне саветаў пралетар і селянін Беларусі ўпісалі не адну гэраічную старонку ў агульнае змаганьне за дыктатуру пралетарыяту.

Аднак, запісанага і ўвекавечанага з гэтага змаганьня мы маем вельмі і вельмі мала. Надзвычай багатае дасьведчаньне і ўрокі партызанскага змаганьня, паўстаньняў, работы падпольных рэвалюцыйных груп і ячэек захоўваюцца нідзе не запісанымі ва ўспамінах паасобных удзельнікаў гэтага вялікага змаганьня. Усе часнасьці і надробнасьці, так важныя для поўнасьці карціны, паасобныя рысачкі, найбольш навучальныя з прычыны іх рэальнай канкрэтнасьці паволі стушоўваюцца ў памяці. Няма чаго і казаць аб тым, што многа чаго і зусім зьнікае.

Гінуць, расьсеяныя, раскіданыя вельмі скупыя дакументы змаганьня, што ў таго-сяго захаваліся.

Між тым усё гэта мае ня толькі вельмі важнае значэньне для гісторыі пралетарскай рэвалюцыі, ня толькі вялізнае рэвалюцыйна-выхаваўчае значэньне ў нашай савецкай школе, у арміі, у нашай асьветнай рабоце.

Магчымы паскок імпэрыялістычных дранежнікаў на СССР можа паставіць у першую чаргу перад працоўнымі Беларусі задачу новага змаганьня. Веданьне змаганьня ў першы пэрыяд павінна аказаць неацэнную паслугу.

Сабраць-жа гэта дасьведчаньне, вывучыць яго, апрацаваць, апублікаваць усё, што магчыма паводле умоў канспірацыі змаганьня на Захадзе, якое адбываецца,—а што немагчыма—перадаць у адпаведныя архівы,—гэту вялізную задачу можна ажыцьцявіць толькі пры актыўнай дапамозе і арганізаванасьці саміх удзельнікаў. Нікіна афіцыяльныя ўстановы сваімі ўласнымі сіламі здавальняюча з гэтай задачай ня справяцца. Патрэбна ініцыятыва мас саміх удзельнікаў.

Таму вялізнай заслугай Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму Беларусі зьяўляецца ініцыятыва ў справе арганізацыі удзельнікаў грамадзянскай вайны, падпольных работнікаў і партызан у камісію па выяўленьні і ўвекавечаньні дасьведчаньня грамадзянскай вайны на Беларусі. Цяпер кіраўніцтва і далейшая арганізацыя работы гэтай камісіі перадана таварыству гісторыкаў-марксыстых Беларусі. Выбрана часовае бюро гэтай камісіі. Зроблен начатак для зьбіраньня матар'ялу, успамінаў, распачата арганізацыя стэнаграфічных запісаў гэтых успамінаў і г. д. Але толькі распачата. І толькі па Менску, галоўным чынам.

А работа павінна ахапіць усіх актыўных удзельнікаў грамадзянскай вайны. У акругах і раёнах многа чырвоных партызанаў і змаганьнікаў, выяўленьне дзейнасьці якіх толькі можа даць суцэльную карціну гісторыі грамадзянскай вайны на Беларусі. Існуючая камісія павінна разрасьціся ў арганізацыю, якая-б ахапіла ўсе акругі і раёны. У акругах павінны знайсьціся таварышы, якія возьмуць на сябе ініцыятыву зьбіраньня, арганізацыі і сувязі ўдзельнікаў з Менскам. Адначасна, на першых часох, зьбіраньне дакумантаў, матар'ялаў, запісаў, што захаваліся. Далей арганізацыю запісаў, праверку фактаў, вывучэньне іх.

У працэсе работы ўзьнікае патрэбнасьць падзяліцца думкамі, мысьлямі па арганізацыі справы. Часопісам пакуль што павінен быць «Бальшавік Беларусі». Нельга выканаць задачы арганізацыі вывучэньня гісторыі грамадзянскай вайны без дакладнага ўліку ўсіх удзельнікаў. Але-ж сьпісу змаганьнікаў у цяперашні час нідзе няма. Кожны з удзельнікаў сам павінен аб сабе заявіць. Сам паведаміць аб сваім удзеле ў грамадзянскай вайне, аб тых матар'ялах, якія ў яго захаваліся, аб тых падзеях, удзельнікам якіх ён зьяўляўся. Месцам асабістай рэгістрацыі і накіраваньня карэспандэнцый зьяўляецца: Менск, Музэй Рэвалюцыі, вуліца Урыцкага, 4-а тэл. Амбросенак.

Па гэтым адрасе трэба зварачацца і за ўсімі даведкамі ва ўсе дні тыдню за выключэньнем панядзелка ад 1-7 г. дня.

Прад гістпартам ЦК КП(б)Б і таварыствам гісторыкаў-марксыстых, узяўшы кіраўніцтва гэтай справай у свае рукі, стаіць вялізарная задача. Зьбіраньне матар'ялаў, іх навуковая праверка, выяўленьне дакладнай карціны асабістых учынкаў гэрояў грамадзянскай вайны, іх увекавечаньне і падлік дасьведчаньня і ўрокаў, апрацоўка і публікаваньне, нарэшце, напісаньне гісторыі—выкананьне гэтай справы, якая мае надзвычайна важнае значэньне для далейшага змаганьня і сацыялістычнага будаўніцтва—магчыма толькі пры самым актыўным і сьвядомым удзеле ўсіх актыўных змаганьнікаў за сацыялізм.

**В. Сэрбэнта.**

# 1-шы ўсебеларускі зьезд лясных працаўнікоў

30-га красавіка скончыў сваю работу 1-шы ўсебеларускі зьезд лясных працаўнікоў. На адным з апошніх пасяджэньняў зьезд заслухаў даклад т. Княжэвіча (прадстаўнік Лесбелу). Гэты даклад выклікаў гарачыя спрэчкі.

Шмат прамоўцаў паказвалі на неабходнасьць перадачы лесазагатовак выключна лесазагу НКЗ. Дзейнасьць Лесбелу павінна разгортвацца на заводах, а ня ў лесе. Нельга патрабаваць ад лясьніцтва адказнасьці, калі ён не зьяўляецца гаспадаром данае гаспадаркі.

З боку Лесбелу няма зацікаўленасьці да лясной гаспадаркі: ён цікавіцца толькі тым каб атрымаць больш драўніны.

Далей зьездам былі заслуханы даклады праф. Мельніка аб праблеме лесаадкаўленьня ў лясох БССР, праф. Захарава аб лясной асьвеце, праф. Фялюшына аб палаўлічай гаспадарцы БССР і інш. Зьездам прыняты рэзалюцыі па ўсіх дакладах.

# Гісторыя адной судовай цяганіны

Пачалася гэта гісторыя 11 месяцаў таму назад. Хутка будзем сьвяткаваць гадовы юбілей. У другой палове мая 1928 году на склад менскага пункту Дзяржгандальбелу прыбыў інспэктар акрангандлю і выявіў там пераплату за цэлую партыю жарабячых скурак... 3 р. 70 к. Загадчык пунктам вылучанец, ён-жа рабкор газэты «Зьвязда», тав. Мазо, тлумачыў гэта тым, што не атрымаў ад кіраўніцтва паведамленьня аб зьмяненьні цэн, а таму пры куплі вялікай партыі скурак такая невялічкая пераплата магчыма.

Але інспэктара гэта тлумачэньне не задаволіла і ён злажыў акт. Акт пашоў у акрангандаль. Акрангандаль пераслаў яго ў Наркамгандаль, а Наркамгандаль ня ўдумаўся ў гэту справу і налажыў рэзалюцыю (вінаватых перадаць суду).

Праз два месяцы пасьля гэтага сьледчы 4-га вучастку пачаў выклікаць да сябе па чарзе: загадчыка пунктам тав. Мазо, загадчыка экспартным аддзелам, карэспандэнта экспедыцыйнага аддзелу і цэлы рад іншых супрацоўнікаў, але пры ўсіх сваіх намаганьнях сьледчы не знайшоў злачынства і рашыў справу спыніць. Лёгка ўздыхнуў т. Мазо, лёгка ўздыхнулі і іншыя працаўнікі. Як-бы ня так? Прайшло 6 месяцаў і справа ўсплыла зноў. Зноў выклікаюць усіх «шкоднікаў» і сьведак.

Мы перадумалі, гаворыць сьледчы 4-га вучастку, суд не агадзіўся в маім заключэньнем і настойвае на перадачы вінаватых суду па абвінавачаньні ў... ажыятажы.

Тут, бачыце, «палітычная ўстаноўка», трэба вывяць вінаватых. Выклікае сьледчы кур'ера Дзяржгандальбелу

— Вы ўручылі распараджэньне аб зьніжэньні расцэнак менскаму пункту, ці не?—пытаецца сьледчы.

— Ня памятаю, адказвае перапалоханы кур'ер.—Я перадаваў менскаму пункту шмат пакетаў, а зараз праз 11 месяцаў ня памятаю. Штодзённа працаўнікі спыняюць заняткі і доўга рыюцца ў лепташніх паперах. Праводзяць часы ў гутарках аб гэтых злапічасных трох рублёх і ня ведаюць, калі гэта скончыцца. Цяжка сказаць. Сьледчаму, праўда, не ўдалося выявіць вінаватых, а суд настойвае і патрабуе, каб вінаваты быў. Знайсьці яго жывога ці мёртвага і даставіць на лаўку падсудных. Няхай пройдзе яшчэ год, яшчэ два, няхай будуць напісаваны на гэту справу яшчэ сотні аркушаў паперы, няхай працаўнікі трацяць па шэсьць гадзін у дзень, але той, хто пераплаціў 3 руб. 70 к., павінен быць пакараны. Так разважае суд. А наркамгандлеўцы чакаюць, калі-ж усё гэта скончыцца.

**Л. МАНІН.**

# Загатоўка рызьзя праводзіцца слаба

Ня гледзячы на цэлы рад дырэктыў рэгулюючых органаў БССР аб неабходнасьці ўзмацніць загатоўку рызьзя—гэты від тавару ў бягучым годзе загатоўлены слаба, загатоўчы плян выкананы толькі на 39 проц. Трэба са ўсёй рашучасьцю падкрэсьліць, што да гэтага часу і каапэрацыя і Дзяржгандальбел вельмі мала зьвярталі ўвагі на гэту загатоўку і ня прымалі мер да выяўленьня ўсіх магчымасьцяй. Ёсьць факты, што прамтавары, якія былі адпушчаны выключна для загатоўкі рызьзя, былі скарыстаны для іншых загатовак, а між іншым загатоўка рызьзя прадстаўляе вялікае значэньне як для мясцовай прамысловасьці, так і для экспарту. З розных краін паступаюць запатрабаваньні на рызьзё. Даволі адзначыць, што прадстаўнікі вядомай у Аўстрыі фірмы «Бунцэль і Біях» прыбылі ў СССР для заключэньня раду дагавораў па куплі рызьзя.

Да загатоўкі рызьзя мала прыцягнуць толькі прасолаў, якія часта злоўжываюць авансамі і прамтаварамі, тут неабходна больш сур'ёзная работа. Трэба прыцягнуць да зборкі рызьзя камітэты ўзаемадапамогі, піянэрскія і камсамольскія арганізацыі, трэба падштурхнуць у самыя глухія раёны БССР папулярную літаратуру аб ролі і значэньні зборкі рызьзя, лапцей, старых ботаў і г. д. Усе гэтыя «дробязі» ў выніку даюць буйны эфэкт.

**Л—кі.**

# Пад знакам буйнога росту

Штодзённа крытыкуючы сваю дзейнасьць, мы жадаем да дня першага мая падлічыць і свае дасягненьні, вызначыць свае далейшыя задачы.

Ня гледзячы на цэлы рад труднасьцяй, сацыялістычныя элемэнты ў нашай краіне растуць, расьце і ўздымаецца наша каапэрацыя, як асобны вельмі важны вучастак агрэмаджаньня народнай гаспадаркі. Возьмем асноўныя паказальнікі працы беларускай спажывецкай каапэрацыі. Лік каапэраваных па сельскай сетцы, які на 1-га кастрычніка 1927 г. складаў 378.000 чалавек, на 1-е красавіка гэтага году дасягнуў 581.000 чалавек. За гэты самы тэрмін процант каапэраваньня гаспадарак павялічыўся з 41,9 да 51,5, процант каапэраваных па рабочай сетцы павялічыўся з 71 да 90.

Расьце і лік каапэраваных жанчын: у сельскай сетцы—10,4 прац., у рабочай—14,7 проц. Па фондзе каапэраваньня беднаты каапэравана 90 тыс. чалавек, а да канца гаспадарчага году гэта лічба павінна дасягнуць 140.000 чал. Удзельная вага спажывецкай каапэрацыі ў раздробным тавараазвароце дасягнула ўжо 55,3 проц.

Такім чынам, каапэрацыя стала галоўным правадніком тавараў да спажыўца.

У галіне хлебапячэньня ў нас ужо працуюць тры хлебазаводы і тры знаходзяцца ў стадыі пабудовы. Такім чынам, ужо блізкі той час, калі мы ў больш буйных гарадох БССР будзем мець мэханізаванае хлебапячэньне. Расьце шпаркім тэмпам і сетка грамадзкага харчаваньня. Мы маем 50 сталовак у галоўных гарадзкіх пасяленьнях БССР. Упяршыню ў гэтым годзе мы ўзяліся за пабудову мэханізаваных сталовак.

Значныя посьпехі ёсьць у галіне культмасавай працы. Утвораны піматтысячны каапэрацыйны актыў як у горадзе, так і на вёсцы, сярод якога ўсё большую і большую ролю адыгрывае жанчына.

Мы ўтварылі значную сетку культурна-бытавых устаноў, дзіцячых садоў, ясьляй, пляцовак, куткоў «маці і дзіця».

На вёсцы спажывецкая сыстэма стала асноўным праваднікам кнігі. Вялізарная праца праводзіцца па прасоўваньні кіно ў вёску.

Гэтыя посьпехі ў нашай працы ні ў якім разе не павінны затушаваць тых хібаў, якія ў нас яшчэ ёсьць.

Якасьць абслугоўваньня спажыўца да гэтага часу яшчэ мала здавальняючая. Чаргі, неадпаведнасьць намяшканьняў, адсутнасьць кваліфікаваных працаўнікоў—гэта высоўвае перад намі задачу надняць на належную вышыню якасьць абслугоўваньня. Барацьба з чаргамі, папярэньне сеткі крам, папярэдняе разважваньне тавараў. Гэта таксама высоўвае задачу капітальнага будаўніцтва як новых складаў, так і крам.

Ажыцьцяўленьне гэтых задач магчыма толькі пры ўкладаньні значных капіталаў, пры хутчэйшым зборы дыфэрэнцыраванага паю.

Асабліва жорстка трэба ўдарыць па ўсіх растратчыках каапэрацыйных сродкаў, бо яшчэ і да гэтага часу гэтае зло значна паширана, асабліва ў вясковай сетцы.

Пытаньне культурнай рэвалюцыі настойліва патрабуе ад нас падняцьця культурна-бытавой працы. Падрыхтоўка і перападрыхтоўка каапэрацыйнага апарату, шырокае распаўсюджваньне каапэрацыйных ведаў сярод асноўнай масы пайшчыкаў і ў першую чаргу каапактыву, утварэньне сеткі бытавых устаноў—павінны стаць у цэнтры ўвагі нашай працы.

Ачыстка каапэрацыйнага апарату ад чужых элемэнтаў, высоўваньне рабочых, беднаты, батракоў павінны быць праведзены са ўсёй рашучасьцю.

Сёньня мы яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліваем, што спажывецкая каапэрацыя пры падтрыманьні і кіраўніцтве камуністычнай партыі ўкладзеныя на яе задачы выканае.

**ФЛЕЕР.**

# Рабкоры, пішэце за мяжу пра 1-ае мая

**«Міжнародная рабкораўская сувязь—магутны сродак клясавай барацьбы, які садзейнічае замацаваньню інтэрнацыянальнай салідарнасьці пралетарыяту».** Так сказала чацьвертая ўсесаюзная нарада рабселькораў у сваёй пастанове аб міжнародній сувязі. У дні майскага сьвята мы ўмовіліся ня толькі падводзіць дасягненьні, але і біць па недахопах. Вось чаму трэба запытаць, што зрабілі рэдкалегіі насьценгазэт БССР у галіне міжнародній сувязі, што яны зрабілі для таго, каб выканаць пастанову нарады рабселькораў?

Мала зрабілі. Некаторыя рэдкалегіі нават не арганізавалі да гэтага часу прапрацоўкі пастаноў нарады рабкорамі. Больш трэба сказаць: некаторыя рэдкалегіі нават самі ня ведаюць, што пастанавіла нарада рабселькораў. Зразумела, пры такім становішчы няма чаго чакаць добрай працы. І характэрна, што такія рэдкалегіі найбольш скарджацца на адсутнасьць кіраўніцтва з боку рэдакцыі і інш. І гэта ў той час, калі пастановы нарады маюць багатыя кіраўнічы матар'ял па ўсіх галінах працы. Некаторыя рэдкалегіі скарджацца на адсутнасьць часу для прапрацоўкі рабселькораўскай літаратуры. Калі гэта так, дык мы павінны яшчэ раз сказаць рэдкалегіям, чаго яны павінны дабіцца ад партыйных і прафэсыянальных органаў, каб іх вызвалілі ад іншых нагрузак, акрамя газэтнай. Мы пісалі, каб за дапамогай у гэтым пытаньні зьвярталіся ў рэдакцыі газэт. Але покуль што «ўсё супакойна», ніхто ня скардзіцца, што іх не вызваляюць ад іншых нагрузак для газэтнай работы. Неабходна знайсьці час для насьценгазэтнай работы, а асабліва цяпер.

Усе рэдкалегіі павінны арганізаваць пасылку за мяжу першамайскіх рабкораўскіх лістоў. Неабходна канкрэтна апісаць, як у кожным калектыве будзе праведзена ўрачыстасьць сьвята. Разам з гэтым вельмі цікава і каштоўна арганізаваць пасылку за мяжу лістоў старых рабочых, якія ўдзельнічалі ў падпольных маёўках пры царызме. Гэтыя ўспаміны будуць пасланы замежным насьценгазэтам.

Гэту работу трэба правесьці тэрміново, каб не спазьніцца з пасылкай лістоў за мяжу.

**І—х.**

# У БССР ачышчана 81.261 тона насеньня

## Весткі на 15-IV-1929 г.

| Акругі | Ачышчана тон | Плянав. заданьне | Проц. выкананьня пляну |
|---|---|---|---|
| Менск. | 16.358 | 18.000 | 91 проц. |
| Магілёўск. | 12.963 | 16.000 | 81 |
| Аршанск. | 12.040 | 15.000 | 80,3 |
| Віцебск. | 7.678 | 9.000 | 85,5 |
| Мазырск. | 4.730 | 6.000 | 79,0 |
| Гомельск. | 10.660 | 15.000 | 76,0 |
| Бабруйск. | 13.011 | 18.000 | 72,0 |
| Полацк. | 3.821 | 10.000 | 38,2 *) |
| Усяго: | 81.261 | 107.000 | 76,0 |

УВАГА: *) У зьвязку з тым, што ў Полацкую акругу завозіцца значная колькасьць насеньня (аўсу, ячменю) ужо ачышчанага, якое ў лік ачышчаных 3.821 тон ня ўключаецца, процант ачысткі па Полацкім як быццам невялікі, па даных-жа Полацкага акрэга плян выкананы на 76 проц.

# Правяраньне сьпісаў „лішэнцаў"

У працэсе разгляду ў цэнтральнай выбарчай камісіі розных хадайніцтваў аб аднаўленьні ў выбарчых правох, а таксама і сьпісаў асоб, якія пазбаўлены выбарчых правоў, выявілася шмат памылак. У зьвязку з гэтым прэзыдыум ЦВК БССР даручыў цэнтральнай і акруговым выбарчым камісіям пераглядзець сьпісы, а таксама і заявы асоб, пазбаўленых выбарчых правоў. Частковыя весткі з раёнаў сьведчаць, што ня ўсюды з выстарчальнай уважлівасьцю падыйшлі да гэтае справы. Напрыклад, Бешанковіцкая райкамісія пастанавіла зрабіць праверку сьпісаў «папутна», у часе пасылкі ўпаўнаважаных па растлумачэньні новага закону аб сельгаспадатку. Грэская райкамісія даручыла гэтую справу беспасрэдна селькамісіям і інш.

Цэнтральная выбарчая камісія разглядзела 210 хадайніцтваў аб абнаўленьні ў выбарчых правох, з якіх задаволена 77.

Прэзыдыум ЦВК даручыў цэнтральнай выбарчай камісіі аднаўляць у выбарчых правох усіх асоб, якія пазбаўлены гэткіх акруговымі камісіямі бяз грунтоўных падстаў. Акрывыканкомам даручана прыняць рашучыя меры да праверкі сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчых правоў.

# Правядзеньне амністыі юбілейнай сэсіі ЦВК БССР

## У Беларусі амніставана 10.978 ч.

Наркамюстам падведзены вініці амністыі, абвешчанай юбілейнай сэсіяй ЦВК БССР. Амністыя была дапасавана да 10.978 асоб, з якіх аслабанёна з-пад варты 1.651. Дапасавана была амністыя галоўным чынам да асоб, асуджаных за наступныя злачынствы супроць жыцьця і здароўя і супроць парадку кіраўніцтва. Асобы, да якіх дапасавана амністыя па сваім сацыяльным становішчы разьмяркоўваюцца: сяляне—90,8 проц., рабочыя—6,7 проц., служачыя—2,2 проц., вайскоўцы (апрача асуджаных ваенным трыбуналам) 0,3 проц. Процант аслабанёных жанчын складае 10,7 проц. да агульнай колькасьці аслабанёных. Акрамя таго, амністыя была дапасавана да 877 асоб, якім было паменшана пакараньне на палавіну.

# Менск

## Фізкультурнікі да Ўсебеларускага Зьезду Саветаў

12-га мая менскія фізкультурнікі наладжваюць вялікую прывітальную дэманстрацыю ў гонар Усебеларускага Зьезду Саветаў, у дэманстрацыі прымуць удзел усе гурткі рабочых клюбаў і школ. Да гэтага-ж дня прыстасоўваецца адчыненьне летняга сэзону. Увечары ў саду «Прафінтэрн» адбудуцца спаборніцтвы футбалістых, баскет-балістых і г. д.

## Тыдзень фізкультуры

З 5-га мая ў Чэрвені пачынаецца тыдзень фізкультуры. На працягу тыдню будзе наладжана агітацыйная праца па ўдзяненьні рабочых у гурткі фізкультуры, арганізуюцца вечары фізкультуры і г. д.

## Вялікі антырэлігійны карнавал

Сёньня ўвечары ў Белдзяржтэатры адбудзецца закрытыя спэктаклі для членаў саюзу мэталістых. Пасьля спэктаклю мэталістыя разам з артыстымі Белдзяржтэатру выйдуць на вуліцу з факеламі і плякатамі і арганізуюць вялікі антырэлігійны карнавал. Да мэталістых далучацца карнавалы іншых клюбаў і саюзаў. Па вуліцах будуць рузьяжджаць на аўтамабілях загрыміраваныя артыстыя, якія наладзяць інсцэніроўкі з сьпевамі на антырэлігійныя тэмы.

Карнавал прадоўжыцца некалькі гадзін.

## За дзень

**Новая школа.** Гарсавет перадаў прыгарожаму сельсавету пад школу камунальны дом № 11 ва ўрочышчы Шапіроўка.

**Першамайскія ўрачыстасьці на экране.** Усе найбольш важныя моманты ў сьвяткаваньні 1 мая ў Менску, засьняты Белдзяржкіно і ўвойдуць у чарговую кіно-хроніку.

**Паездка піянэрскай дэлегацыі па БССР.** Інтэрнацыянальная піянэрская дэлегацыя, якая прыехала в Масквы ў Менск, падзялілася на 3 групы. Групы накіраваліся ў Менскую, Гомельскую і Бабруйскую акругі, дзе яны азнаёмяцца з жыцьцём яўрэйскіх калгасьнікаў, а таксама піянэрскіх арганізацый.

**Зьезд па барацьбе з алкагалізмам.** Беларусі прадастаўлена з месцы на Ўсесаюзным зьезьдзе па барацьбе з алкагалізмам, які склікаецца ў Маскве 30 мая.

**14 новых ясьляў.** У дні першамайскіх сьвят у саўгасах Менскай акругі адкрылася 14 новых ясьляў.

**2.000 р. на карысьць палітзьняволеных капіталістычных турмаў.** Скарбовкавы збор, наладжаны ЦК Мопр'у па Менску, даў каля 2.000 р. У дадзенай скарбонцы была знойдзена валатая пяцірублёўка.

**Удзел батраноў у дэманстрацыі.** У першамайскай дэманстрацыі прыняло ўдзел 150 батракоў і пастухоў, якія прыехалі ў Менск з розных раёнаў. Увечары батракі наведалі тэатры і кіно.

## Пабудуем самалёт і танк

### ПА ВЫКЛІКУ НАСЬЦЕНГАЗЭТЫ МАЗЫР. АВК

Рэдкалегія насьценгазэты «Наша жыцьцё». (Мен. АВК) ад імя рабкораў і чытачоў уносіць 49 руб. 75 к.

Збор сродкаў працягваецца.

***

Рэдкалегія насьценгазэты працкалектыву абутнікаў № 1 (Менск) ад імя рабкораў і чытачоў газэты ўносіць 53 руб. 25 к.

## Мен. Акругком МОПР'у

паведамляе ўсе ячэйкі МОПР'у, а таксама прадпрыемствы і ўстановы, якія ўзялі лётарэйныя карты на канцэрт 20-га мая, што грошы за лётарэйныя карты павінны быць унесены на пазьней 8-га мая. Да гэтага-ж тэрміну неабходна застаўшыяся па якіх небудзь прычынах неразыграныя карты зьвярнуць у АК МОПР'у.

АК МОПР'у.

## ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

У суботу, 4 мая, а 5 гадз. дня, у памашканьні Акругкому МОПР'у адбудзецца паседжаньне прэзыдыуму Мен. АК МОПР, на яное ўсе члены і кандыдаты АК, знаходзячыся ў г. Менску, павінны зьявіцца без спазьненьня.

Яўка для членаў прэзыдыуму абавязкова.

Запрашаюцца гор. антывістыя

АК МОПР'у

— РЭСПУБЛІКАНСКАЕ БЮРО «ОРУ». Сёньня 4 мая роўна а 6 гадз. увечары ў памяшк. Скурэндынату (рог. Камсамольскай і Рэвалюцыйнай 16|10 б. лячэбніцы д-ра Шапіра) адбудзецца чарговае паседжаньне рэсп. бюро «ОРУ», парадак дня:

1. Аб удзеле «ОРУ» ў агляндзе эканомпрацы каапэрац.-гандлёвых устаноў і прадпрыемстваў г. Менску.
2. Справаздача камісіі «ОРУ» па павыш. кваліфікацыі.
3. Справаздача «АКЭ».
4. Аб арганізацыі каштарысна-бюджэтнай озкіцы «ОРУ».
5. Бягучыя справы.

Запрашаецца актыў «ОРУ».

— Сёньня а 6 гадз. увечары, у памашканьні Кастрычніцкавага РК КП(б)Б адбудзецца нарада сакратароў ячэек КП(б)Б па пытаньні аб перавыбарах бюро ячэек.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

— МАКК просіць зьявіцца на паседжаньне парттройкі, якое адбудзецца 9-га мая 1929 г. а 6 з пал. гадз. Увечары, у памяшканьні канцылярыі АКК (Энгельса, 28) наступных таварышоў: 1) Кацца А. Н. (яч. гарбарні), 2) Гуранкова Ф. Я. (яч. Белдзяржбуду), 3) Данішэўскага О. С. (яч. гарбарні), 4) Малінькінава (яч. Сакалхлеба), 5) Баркоўскага Я. П. (яч. міліцыі), 6) Мардачова А. М. (яч. міліцыі), 7) Крайвец Р. З. (яч. хлебазаводу). 8) Блоцкага Хведара Арцем'явіча, 9) Калмагорава (яч. МЦРК), 10) Топчэнка М. М. (яч. ваенведу), 11) Манкарэвіча І. Д. (яч. Белдзяржбіно).

Яўка ўсіх таварышоў, а таксама сакратароў тых ячэек КП(б)Б таварышы якіх, выклікаюцца на паседжаньне парттройкі абавязкова.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

# Другі тыраж выйгрышаў 2-й пазыкі індустрыялізацыі

## Па безпроцанта-выйгрышным выпуску

| №№ серый | №№ облігацый | Сумма выйгрышу в руб. |
|---|---|---|
| 00.030 | 1—25 | 100 |
| 00.038 | 1—25 | 100 |
| 00.345 | 1—25 | 100 |
| 00.560 | 1—25 | 100 |
| 00.613 | 1—25 | 100 |
| 00.813 | 1—25 | 100 |
| 00.821 | 12 | 1.000 |
| 00.921 | 1—11; 13—25 | 100 |
| 01.066 | 1—25 | 100 |
| 01.186 | 1—25 | 100 |
| 01.526 | 1—25 | 100 |
| 01.968 | 1—25 | 100 |
| 02.423 | 1—25 | 100 |
| 02.550 | 25 | 1.000 |
| 02.590 | 1—4; 6—25 | 100 |
| 02.691 | 1—25 | 100 |
| 03.045 | 1—25 | 100 |
| 03.059 | 1—25 | 100 |
| 03.144 | 1—25 | 100 |
| 03.216 | 1—25 | 100 |
| 03.307 | 1—25 | 100 |
| 03.550 | 1—25 | 100 |
| 04.002 | 1—25 | 100 |
| 04.079 | 1—25 | 100 |
| 04.226 | 1—25 | 100 |
| 04.287 | 10 | 1.000 |
| 04.267 | 1—9; 11—25 | 100 |
| 04.422 | 1—25 | 100 |
| 04.446 | 1—25 | 100 |
| 04.703 | 1—25 | 250 |
| 05.079 | 29 | 1.000 |
| 05.073 | 1—22; 24—25 | 100 |
| 05.290 | 1—25 | 100 |
| 05.375 | 1—25 | 100 |
| 05.638 | 1—25 | 100 |
| 05.752 | 1—25 | 100 |
| 05.971 | 1—25 | 100 |
| 06.024 | 1—25 | 100 |
| 06.055 | 1—25 | 100 |
| 06.057 | 1—25 | 100 |
| 06.128 | 1—25 | 100 |
| 06.243 | 1—25 | 100 |
| 06.636 | 1—25 | 100 |
| 06.631 | 1—25 | 100 |
| 06.769 | 1—25 | 100 |
| 06.874 | 1—25 | 100 |
| 07.129 | 1—25 | 100 |
| 07.135 | 1—25 | 100 |
| 07.262 | 1—25 | 100 |
| 07.721 | 1—25 | 100 |
| 07.917 | 1—25 | 100 |
| 08.567 | 1—25 | 100 |
| 08.720 | 1—25 | 100 |
| 09.018 | 1—25 | 100 |
| 09.173 | 1—25 | 100 |
| 09.662 | 1—25 | 100 |
| 09.700 | 1—25 | 100 |
| 09.724 | 1—25 | 100 |
| 09.868 | 1—25 | 100 |
| 09.921 | 1—25 | 100 |
| 10.108 | 1—25 | 100 |
| 10.349 | 1—25 | 100 |
| 10.447 | 1—25 | 100 |
| 10.460 | 1—25 | 100 |
| 10.530 | 1—25 | 100 |
| 10.606 | 1—25 | 100 |
| 10.665 | 1—25 | 100 |
| 10.649 | 1—25 | 100 |
| 10.993 | 24 | 1.000 |
| 10.993 | 1—23; 26 | 100 |
| 11.238 | 1—25 | 100 |
| 11.251 | 1—25 | 100 |
| 11.487 | 1—25 | 100 |
| 11.701 | 1—25 | 100 |
| 12.103 | 1—25 | 100 |
| 12.177 | 1—25 | 250 |
| 12.658 | 1—25 | 100 |
| 12.713 | 1—25 | 100 |
| 12.958 | 1—25 | 100 |
| 13.121 | 1—25 | 100 |
| 13.176 | 1—25 | 100 |
| 13.347 | 1—25 | 100 |
| 13.780 | 1—25 | 100 |
| 13.816 | 1—25 | 100 |
| 13.885 | 1—25 | 100 |
| 14.114 | 1—25 | 100 |
| 14.348 | 8 | 1.000 |
| 14.348 | 1—7; 9—25 | 100 |
| 14.485 | 1—25 | 100 |
| 14.994 | 1—25 | 100 |
| 15.196 | 1—25 | 100 |
| 15.323 | 1—25 | 100 |
| 15.541 | 1—25 | 100 |
| 15.566 | 10 | 1.000 |
| 15.566 | 1—9; 11—25 | 100 |
| 15.720 | 25 | 1.000 |
| 15.720 | 1—24 | 100 |
| 15.756 | 1—25 | 100 |
| 15.799 | 1—25 | 100 |
| 15.829 | 1—25 | 100 |
| 15.882 | 1—25 | 100 |
| 16.060 | 1—25 | 100 |
| 16.142 | 9 | 1.000 |
| 16.142 | 1; 3—25 | 100 |
| 16.184 | 1—25 | 100 |
| 16.246 | 1—25 | 100 |
| 16.545 | 1—25 | 100 |
| 16.559 | 1—25 | 250 |
| 16.566 | 1—25 | 100 |
| 16.584 | 1—25 | 100 |
| 16.609 | 1—25 | 100 |
| 17.091 | 1—25 | 100 |
| 17.625 | 1—25 | 100 |
| 17.710 | 1—25 | 100 |
| 17.867 | 1—25 | 100 |
| 17.981 | 1—25 | 100 |
| 18.065 | 1—25 | 100 |
| 18.316 | 1—25 | 100 |
| 18.467 | 1—25 | 100 |
| 18.766 | 1—25 | 100 |
| 18.818 | 1—25 | 100 |
| 18.843 | 1—25 | 100 |
| 18.979 | 1—25 | 100 |
| 18.998 | 1—25 | 100 |
| 19.008 | 1—25 | 100 |
| 19.011 | 3 | 1.000 |
| 19.011 | 1—2; 4—25 | 100 |
| 19.325 | 1—25 | 100 |
| 19.544 | 1—25 | 100 |
| 19.787 | 1—25 | 100 |
| 19.912 | 1—25 | 100 |
| 19.995 | 1—25 | 100 |
| 20.279 | 1—25 | 100 |
| 20.488 | 1—25 | 100 |
| 20.617 | 1—25 | 100 |
| 20.633 | 1—25 | 100 |
| 20.642 | 1—25 | 100 |
| 20.689 | 1—25 | 100 |
| 20.793 | 1—25 | 100 |
| 20.818 | 1—25 | 100 |
| 20.832 | 1—25 | 100 |
| 20.898 | 1—25 | 100 |
| 20.942 | 1—25 | 100 |
| 20.956 | 1—25 | 100 |
| 20.987 | 1—25 | 100 |
| 21.124 | 1—25 | 250 |
| 21.180 | 1—25 | 100 |
| 21.261 | 1—25 | 100 |
| 21.589 | 1—25 | 100 |
| 21.872 | 1—25 | 100 |
| 22.053 | 1—25 | 100 |
| 22.165 | 1—25 | 100 |
| 22.263 | 1—25 | 100 |
| 22.466 | 1—25 | 100 |
| 22.496 | 1—25 | 100 |
| 22.508 | 1—25 | 100 |
| 22.644 | 1—25 | 100 |
| 23.005 | 14 | 1.000 |
| 23.005 | 1—13; 15—25 | 100 |
| 23.093 | 1—25 | 100 |
| 23.074 | 1—25 | 100 |
| 23.518 | 1—25 | 100 |
| 23.600 | 1—25 | 100 |
| 23.626 | 1—25 | 100 |
| 23.879 | 1—25 | 100 |
| 24.024 | 1—25 | 100 |
| 24.324 | 1—25 | 100 |
| 24.405 | 1—25 | 100 |
| 24.424 | 1—25 | 100 |
| 24.605 | 1—25 | 100 |
| 24.787 | 1—25 | 250 |
| 24.877 | 1—25 | 100 |
| 24.920 | 1—25 | 100 |
| 25.032 | 1—25 | 100 |
| 25.033 | 1—25 | 100 |
| 25.254 | 1—25 | 100 |
| 25.780 | 1—25 | 100 |
| 25.894 | 14 | 5.000 |
| 26.894 | 1—13; 15—25 | 100 |
| 25.977 | 1—25 | 100 |
| 26.044 | 16 | 1.000 |
| 26.044 | 1—17; 19—25 | 100 |
| 26.512 | 1—25 | 100 |
| 26.890 | 1—25 | 100 |
| 27.186 | 1—25 | 100 |
| 27.677 | 1—25 | 100 |
| 27.773 | 1—25 | 100 |
| 27.997 | 1—25 | 100 |
| 28.100 | 1—25 | 100 |
| 28.253 | 1—25 | 100 |
| 28.326 | 1—25 | 250 |
| 28.669 | 1—25 | 100 |
| 28.673 | 1—25 | 100 |
| 28.872 | 1—25 | 100 |
| 28.884 | 1—25 | 100 |
| 28.911 | 1—25 | 100 |
| 29.553 | 3 | 1.000 |
| 29.553 | 1—7; 9—25 | 100 |
| 29.641 | 1—25 | 100 |
| 29.868 | 7 | 1.000 |
| 29.869 | 1—6; 8—25 | 100 |
| 30.090 | 1—25 | 100 |
| 30.131 | 9 | 1.000 